Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 8 1933 г. АУТОРАК № 173 (4717)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Добра і ў тэрмін засеяць азімыя. М. Горкі—Аб выхаваньні праўдай (2 стар.). Чарнушэвіч — Забясьпечым высокую якасьць вучобы добрай падрыхтоўкай навучальнага году (3 стар.).

АБ ХОДЗЕ РАБОТ ПА ТЭРПЭНТЫНАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР —пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР (3 стар.).

ТОЛЬКІ ТОЙ ГЭКТАР ЛІЧЫЦЬ УБРАНЫМ, НА ЯКІМ УБРАНЫ ЎСЕ КАЛАСЫ (1 стар.).

АРГАНІЗАВАЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ ПАРТЫЙНА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ З КАНДЫДАТАМІ І СПАЧУВАЮЧЫМІ (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ: Бязупынныя арышты і сьмяротныя прыговоры суды. Гітлер адкладвае барацьбу з беспрацоўем. Разкае скарачэньне гандлю ў Германіі. Фашысцкая чыстка германскіх органаў юстыцыі (4 ст.).

ТОЛЬКІ ТОЙ ГЭКТАР ЛІЧЫЦЬ УБРАНЫМ, НА ЯКІМ УБРАНЫ УСЕ КАЛАСЫ

ДОБРА І Ў ТЭРМІН ЗАСЕЯЦЬ АЗІМЫЯ!

Наша рэспубліка **ШЧЫЛЬНА ПАДЫШЛА ДА СЯЎБЫ АЗІМЫХ.**

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй сілай падкрэсьліў што раньнія, ушчыльненыя тэрміны сяўбы—важнейшае зьвяно ў барацьбе за высокі ўраджай азімых.

Сяўба азімых павінна пачацца ні ў якім разе не пазьней **20 ЖНІЎНЯ** з тым, каб скончыць яе максымум **5 ВЕРАСЬНЯ.** Ні на адзін дзень пазьней!

Мы павінны засеяць азімінай **1.260** тыс. гэктараў. Прычым у якасьці **ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧЫ** вылучаецца **МАКСЫМАЛЬКАЕ ПАШЫРЭНЬНЕ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ.**

Пленум ЦК і ЦКК устанавіў мінімальны клін азімай пшаніцы ў **60.000** гэктараў.

Гэта зусім рэальная і абавязковая лічба. Мы маем літаральна ўсе магчымасьці для таго, каб гэта заданьне ня толькі выканаць, але і перавысіць.

Пытаньне вырашаюць якасьць і тэрміны правядзеньня сяўбы.

Пад азімую пшаніцу трэба падрыхтаваць самыя лепшыя чыстыя папары. Кожны гэктар павінен быць добра апрацаван, угноєн і засеян выключна ачышчаным і пратручаным насеньнем.

Сваячасовая мабілізацыя насенных фондаў—аснова асноў. Насеньне трэба падрыхтаваць з унутраных рэсурсаў.

Кулацкае ахвосьце добра ўяўляе, якое гігантскае значэньне мае пашырэньне насеваў азімай пшаніцы. І во враг, базумоўна, будзе прабаваць разбазарыць, раскрасьці насенныя фонды, спэкулюючы на спажывецка-месьніцкіх настроях адсталых калгасьнікаў.

Патрэбна асаблівая пільнасьць, асаблівая непрымірымасьць да манэўраў кулацкага ахвосьця. Трэба з усёй сілай, з усёй рашучасьцю ламаць малейшае праяўленьне кулацкага сабатажу і шкодніцтва.

Як на практыцы мабілізаваць насеньне?

Пасьля выканаўньня абавязацельстваў перад дзяржавай поўнасьцю ссыпаць ураджай гатунковай пшаніцы па насеньне, не дапусьціўшы раз базарваньня яго на спажывецкія патрэбы.

Па-другое, трэба шырока разгарнуць міжкалгасныя абменныя апэрацыі. А ў цэлым гэта дае поўную магчымасьць цалкам забясьпечыць азімы клін насенным матар'ялам, прычым трэба асаблівую ўвагу аддаць яго якасьці.

Мы павінны асвоіць і засеяць азімы пшанічны клін выключна за кошт нашых **УНУТРАНЫХ** рэсурсаў.

У чым асаблівасьці бягучай азімай сяўбы.

Асноўнае ў тым, што ў гэтым годзе толькі трэцяя частка азімага кліну будзе засеяна на чыстых папарах. Большая частка азімага кліну (ня менш двух трэцяй) павінна быць засеяна на папарах, занятых яравымі.

Ужо адно гэта паказвае, якую максымальную апэрацыйнасьць, якую энэргію трэба праявіць, каб сваячасова падрыхтаваць плошчу пад азіміну.

Уборку трэба арганізаваць так, каб скончыць ворыва вучасткаў пад азімыя не пазьней 10 жніўня.

І ў першую чаргу, як указаў пленум ЦК і ЦКК нашай партыі, трэба пасьля чыстых папараў падрыхтаваць плошчы з пад вікі, раньняй скорасьпелай бульбы і г. д.

Што гэта значыць?

Гэта значыць, што трэба даражыць кожнай мінутай, што трэба, рашуча паскараючы ўборку і пастаўкі, забясьпечыць сваячасовую падрыхтоўку плошчы пад азіміну.

Возьмем прыклад з калгасу **«ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ»**, Міхееўскага сельсавету (Крычаў), аб якім мы сёньня сьмяшчаем матар'ялы ў «Зьвязьдзе».

Калгас ужо зараз на справе падрыхтован да сяўбы. Кожны гэктар чыстых папараў дагледжан. Чыстыя папары прабаранаваны і добра ўгноены. Праведзена паўторнае ворыва на поўную глыбіню. Падрыхтаваны і вучасткі з-пад вікі.

Калгас абавязаўся пачаць сяўбу з 15 жніўня і бязумоўна пры такой ударнай падрыхтоўцы і засее азімыя да тэрміну.

Вось што значыць правільная расстаноўка сіл, уменьне спалучыць уборку і збожжапастаўкі з баявой падрыхтоўкай да азімай сяўбы.

Такіх прыкладаў, на жаль, яшчэ зусім мала. З усёй сілай трэба сказаць, што падрыхтоўка да сяўбы разгорнута зусім дрэнна.

Чаго варта ўжо адно тое, што яшчэ і цяпер няма нават дакладных плянаў сяўбы. Справа ідзе пакуль што ўсьляпую. Раёны і па сёньняшні дзень недапушчальна марудзяць з давядзеньнем плянаў, а з боку апарату НКЗ БССР няма належнай апэрацыйнасьці, няма добрага кантролю.

Укажам на Полацак, дзе па віне райсэмаддзелу яшчэ і зараз ні адзін калгас ня ведае, колькі ён павінен засеяць азімых.

Па дробна-буржуазнай распушчанасьці, па сабатажы ўстаноўленых ЦК і СНК тэрмінаў—моцны і рашучы ўдар!

Ні аднэй мінуты далейшай марудзнасьці!

Павышаючы тэмпы і якасьць уборкі, забясьпечыўшы датэрміновае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, мы павінны ў тэрмін і добра засеяць азімую пшаніцу і ўвесь азімы клін.

Мы павінны сваячасова правесьці зяблева і максымальна асвоіць цаліну. Мы павінны дабіцца, каб уся азімая сяўба праходзіла ў поўнай адпаведнасьці з устаноўленымі севазваротамі, рашуча ламаючы малейшыя спробы скараціць збожжавыя пасевы.

За высокаякаснае і датэрміновае правядзеньне ўборкі і выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай!

За добры і сваячасовы засеў азімага кліну і асабліва азімай пшаніцы!

СЯЎБУ АДКЛАЛІ НА ВЕРАСЕНЬ

КРЫЧАЎ, 6.

Калгас **«ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ»**, Міхееўскага сельсавету, паказвае прыклад, як трэба рыхтавацца да сяўбы азімых. Калгас поўнасьцю скончыў бараваньне папараў. Усе чыстыя папары паўторна ўзораны на поўную глыбіню. Праводчая брыгада завярнае ворыва вучасткаў з-пад вікі. Тут будзе засеяна азімае жыта.

На палі поўнасьцю вывешан шчыт. Сеяць азіміну калгас пачне 15 жніўня.

Але гэты прыклад — выключэньне. У раёне ня рыхтуюцца да сяўбы. Шкодным тэндэнцыям адкласьці сяўбу на верасень не даецца адпор.

Характэрнай ілюстрацыяй можа служыць Кашланскі сельсавет. Тут фактычна ні адзін калгас ня рыхтуецца да сяўбы.

Калгас імя Молатава не падрыхтаваў да сяўбы ні аднаго гэктара. Чыстыя папары не апрацаваны. Старшыня калгасу Дзерабін адкрыта выступае супроць гэтай неабходнейшай і абавязковай меры.

Калгас «Іскра» адкладвае сяўбу на верасень. Старшыня калгасу Гарнакоў так і заяўляе:

— Добра будзе нам, пачнем сеяць з першага верасьня.

Раённая газэта «Сацыялістычны шлях» падае яшчэ рад фактаў, якія сьведчаць, што ў Крычаве праз азімую сяўбу, скромна кажучы, забываюць.

Характэрнай ілюстрацыяй можа

„ПЛЯНАВАЯ" БЛЫТАНІНА

ПОЛАЦАК, 6. (Ад нашага карэспандэнта).

У Полацкім раёне зусім ня рыхтуюцца да сяўбы азімых. Стаўка на саматёк, шкаднейшая тэндэнцыя адкласьці сяўбу на позьні час даюць ся ве розка адчуваць.

Сяўба азімых па парозе, а ў раёне нават няма дакладных пасеўных плянаў. Пляны мяняюцца як на двор'е. Сёньня адзін, заўтра—другі.

Спачатку выпрацавалі плян настолькі блытаны, што неадкладна прыйшлося яго перарабляць. 29 чэрвеня склалі другі плян і на гэтым паставілі кропку. Плян ня спушчан у сельсаветы і калгасы і да сёньняшняга дня.

Ня дзіва, што калгасы нават і ця пер ня ведаюць, колькі ім трэба сеяць. Старшыня калгасу «Парыская камуна», напрыклад, ня можа адказаць на пытаньне, колькі калгас засеяў азімых. Такое-ж становішча літаральна і ў іншых калгасах. Вывазка гною і апрацоўка папараў не разгорнута.

Райком КП(б)Б павінен ужыць рашучыя захады ў адносінах райсэмаддзелу, які зрывае сваячасовае правядзеньне сяўбы азімых.

УБОРКА У СЬЛЯПУЮ

РАШУЧА ПАКОНЧЫЦЬ З ІГНАРАБАЎНЕМ УЛІКУ

МАГІЛЕЎ, 6.

Фармальна лічацца ў калгасе **«САЦЫЯЛІСТ»**, Княжыцкага сельсавету, дзьве вытворчыя брыгады. Заданьні па ўборцы даны кожнай паасобнай брыгадзе. Вызначаны масывы збожжа, замацаваныя за брыгадамі.

Бяда, аднак, у тым, што ўсё гэта зроблена толькі на паперы. Ужо на другі дзень уборкі—9-та жніўня—жнявярка брыгады № 2 выехала на вучастак першай брыгады, а калгасьнікі першай брыгады выйшлі жаць ячмень на полі другой. Усё **ПЕРАБЛЫТАЛАСЯ.**

Жнявярка прастойвае на полі: яна дрэнна адрамантавана. Паўторны рамонт калгас даручыў цьвёрдазаданьніку Пахому Еселеву. Зразумела, машына зноў не пашла. Кулак паставіў старыя зрэзаныя нажы.

Жанчыны ў брыгадзе таксама расстаўлены няправільна: працуюць скопам.

Ня дзіва, што лепшая жнея Яраш ова на пытаньне, як выконваеце норму—адказвае:

— Ня ведаю. Я ўпэўнена, што сама выконваю, але як тут, калі працуеш агулам, разьбярэш.

Калгасьнікі нават не знаёмы з нормамі выпрацоўкі Улік працадзён не наладжан.

Калгас «Першы май», Княжыцкага сельсавету.

Жанцы расстаўлены правільна: зьвеньні па 3-4 чал. Гутарым з жанцамі.

— Якія нормы па жніве?

— Хто яго ведае. І працоўных кніжак няма.

Што выпрацуем—невядома — гаварыць у адным зьвяне.

Падыходзім да другога зьвяна. Зноў тое-ж самае.

Тут-жа, на полі, выяўляем і такі характэрны факт: сям'я цьвёрдазаданьніка Тамахова выключана з калгасу як кулацка-заможная, а ў сапраўднасьці —сядзіць у калгасе па-старому. І гэта зроблена з **ВЕДАМА і ЗГОДЫ** стар шыні калгасу і сакратара ячэйкі.

Блытаніна ва ўліку працадзён — справа варожых рук. Брыгадзір **БУЛАНАЎ,** які сьвядома патурае прагульшчыку і гультаю.

У гэтым-жа калгасе працуе жнявярка—снопавязалка на трактарнай цязе. Выкарыстоўваюць машыну злачынна. **ЗАСТАЕЦЦА ШМАТ НЯЗЖАТЫХ КАЛАСОЎ,** іх ніхто не падбірае і яны гінуць.

Яшчэ некалькі фактаў. Саўгас «Зара». Тут пачалі са жніва ячменю. Вытворчы плян з першых дзён зрываецца. Працуюць толькі 2 жнявяркі; яны зжынаюць 7 гэктараў у дзень, а ўбраць трэба ў першую чаргу сьпелыя вучасткі азімага жыта—62 га і 44 га ячменю. Убрана-жа толькі 11 гэктараў.

Асабліва небясьпечна ігнараваньне вязаньня зжатага ячменю ў снапы. **ВЯЗАНЬНЕ Ў СНАПЫ НЕ АРГАНІЗАВАНА.**

Як саўгас падрыхтаваўся да малаць бы? Дырэктар тав. Чарноў бадзёра заяўляе:

— Малатарня гатова, астаноўка за... дробязьзю—трактары няспраўны: два ў рамонце, адзін—без падшыпнікаў.

Шкодны самасупакой!

ДОБРЫ ПРЫКЛАД арганізацыі ўборкі, малацьбы і правядзеньня збожжапаставак паказвае калгас **«ПЕРШЫ МАЙ»**, Вішоўскага сельсавету.

На жніве працуюць 2 жнявяркі і каля 100 жанчын. Убраць трэба ў першую чаргу 90 га жыта і 26 га ячменю. Жыта пасьпела. Сьпелыя вучасткі убіраюцца паступова, па меры пасьпяваньня, ячмень—таксама.

Гэтымі днямі выпадалі буйныя дажджы. Зерня сырое. З поля малаціць нельга. Калгас арганізаваў сушку. Прасушаныя снапы добра вымалочваюцца. З-пад малатарні збожжа адвозіцца дзяржаве. 4 жніўня калгас здаў звыш 15 цэнтнэраў. 10 жніўня калгас мяркуе поўнасьцю выкапаць плян збожжапаставак па азімых. Арганізавана падрабаньне каласоў, пільная ахова ўраджаю. **КАЛАСЫ НЕ ЗАСТАЮЦЦА НА ПОЛІ.**

Але і ў гэтым прыкладным калгасе Вішоўскага сельсавету ёсьць недахопы ў арганізацыі працы: сілы ў вытворчых брыгадах разьбіты няроўнамерна. Напрыклад, у брыгадзе № 1 —120 чал. Брыгадзір тав. Макарэнка крыўдзіцца:

— Не магу ўсяго ахапіць.

Няма зьвеньняў. Працуюць вялікімі групамі. Вось 4 жніўня працавалі на жніве групы: 16, 14, 10 і 9 чал., па зносцы снапоў—16 чалавек у групе і г. д.

І, нарэшце, трэба падкрэсьліць няправільную ўстаноўку Вішоўскай парт'ячэйкі (сакратар Кандрацьцеў) здаваць збожжа толькі гуртам, усім разам, пэрыядычнымі чырвонымі абозамі. На пленуме сельсавету 3 жніўня старшыня калгасу «Чырвоны баец» Несьцераў нават прапанаваў—пачакаць з чырвоным абозам 6 жніўня, сабраць больш збожжа, тады і везьці.

І нават калгасу «1 май», які падрыхтаваў чырвоны абоз на 4 жніўня, вызначыў людзей, сакратар парт'ячэйкі прапанаваў:

— Пачакай, павязем усе разам.

Такая ўстаноўка—скажэньне дырэктыў аб тым, каб **ЗДАВАЦЬ ЗБОЖЖА ПРОСТА З-ПАД МАЛАТАРНІ НА ПРЫЁМАЧНЫ ПУНКТ.**

З усёй сілай трэба таксама падкрэсьліць, што, захапляючыся чырвонымі абозамі збожжа з калгасаў, той самы Вішаўскі сельсавет не зварачае ўвагі на аднаасобнікаў, якіх у сельсавеце 60 проц. Аднаасобнікі жнуць, малоцяць, а дзяржаве пакуль, што не здаюць. Сярод іх не вядзецца ніякай работы.

А. МІКУЦКІ.

ПАД СУД ЗА СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ

Б.-КАШАЛЕЎСКАЯ, 7. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

Б.-КАШАЛЕЎСКІ І ПАТАПАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ СТАЛІ НА ШЛЯХ АРГАНІЗАЦЫІ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ ПА ЦЬВЁРДЫХ ПАСТАЎКАХ АЗІМАГА ЗБОЖЖА. У СЕЛЬСАВЕТАХ ФАКТЫЧНА ЗАСЕЯНА ПАД АЗІМЫЯ МЕНШ ЧЫМ ЯНЫ ПАВЕДАМЛЯЛІ Ў СВАІХ ЗВОДКАХ.

КАБ ЗАМАСКАВАЦЬ СВАЕ АШУКАНСТВА, СЕЛЬСАВЕТЫ ДАВЯЛІ ДА КОЖНАЙ ГАСПАДАРКІ Ў ПАРАДКУ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ ПА 0,4 ГА.

Л.

Зьвяно Ганны

Першы дзень уборкі жыта. Ударніцы пасеўнай і праполачнай —Грыціна, Хвядора, Ганна і Агапа—зноў сустроліся на полі.

Усю вясну і ўсё лета гэтае зьвяно штодзенна без прагулаў і спазьненьняў выходзіла ў поле. Ударніцы разам вазілі гной, разам хадзілі за плугам, разам садзілі бульбу, разам палолі лён і зараз на адным вучастку жыта весела зацягваюць песьню.

Белыя хусткі тонуць у густой і вялікай азіміне.

— Прымеце і мяне ў вапа зьвяно —папрасілася Пракопава Алеся.

— Калі пасьпееш за намі—станавіся,—дае згоду **СТАРШАЯ** па зьвяну **БЛЯХАВА ГАННА.**

Алеся вясной мала выходзіла на працу: у яе малое дзіця.

— Зараз маё дзіця ў ясьлях —гаворыць Алеся—і я за вамі пасьпею.

Калгасьніцы стараюцца не адстаць адна ад другой. І яны зусім не заўважылі, як да іх падышоў высокі мужчына, біз шапкі з ваеннай сумкай у руках.

— Добры дзень, ударніцы,—пачулі жнеі голас з-заду сябе.

— А добры дзень,—адказвае зьвяно, не пакідаючы працы.

Начальнік палітаддзелу т. Серафімаў (высокі мужчына быў ім) заадзе пытаньні.

На пытаньні адказваюць то адна, то другая, не адрываючыся ад сярпа.

— А ці вас прэміявалі за ударную работу,—пытае т. Серафімаў.

Махрачова Грыціна:

— Нас чацьвярых прэміявалі за сяўбу.

Бляхава Ганна:

— І зараз змагаемся за пярэшынства.

Жнеі адыходзяць усё далей і далей. Яны набліжаюцца да іржышча, дзе пакінуў свае сьляды трактар са снопавязалкай.

— Густое жыта—гаворыць паміж сабой Агапа з Грыцінай.

— Больш атрымаем—умяшалася Ганна.

Тав. Серафімаў дачакаўся, пакуль жнеі сабраліся на абед. Зноў гутарка.

— Я да калгасу батрачыла—дзеліцца Ганна з начальнікам палітаддзелу,—я ў кулака за 30 пудоў цэлы год працавала без адпачынку.

— А за гэты год ведаеш, колькі атрымаеш,—пытае тав. Серафімаў.

— Не, яшчэ ня ведаю.

НА ВАШ КАЛГАС ПРЫПАДЗЕ ПА 7 КІЛЕ ЗБОЖЖАВЫХ НА ПРАЦАДЗЕНЬ,—тлумачыць начальнік, —а колькі ў цябе будзе працадзён?

— Будзе больш 300,—упэўнена гаворыць Ганна.

Ну, і атрымаеш **БОЛЬШ 200 ПУДОЎ** толькі аднаго збожжа,—падлічыўшы, адказаў Серафімаў.

— Ого — зьдзівілася Бяркоўская Агапа—я на гэтым полі да калгасу ў дваіх з маткаю працавалі ў кулака Башлакова Ахрэма за поўпуда хлеба.

Ударніцы пашлі абедаць.

Вечарам начальнік палітаддзелу праверыў, колькі выпрацавала ўдарнае зьвяно.

ЗАДАЎНЬНЕ ПЕРАВЫКАНАНА НА 7,5 СОТАК,—паведаміў брыгадзір.

ДВАРЗЦКІ.

Калгас «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», 4-я брыгада.

Парышынскі сельсавет. ГОРКІ.

І ТЭМПЫ, І ЯКАСЬЦЬ

СЛУЦАК, 6.

Калгас **«НОВАЕ ЖЫЦЬЦЕ»** адным з першых у раёне ўбраў азімае жыта. 4 жніўня ажмы клін жыта ў 172 га быў **ПОЎНАСЦЮ УБРАНЫ.**

Разгортваецца дамолот. У калгасе поўным ходам працуе трактарная малатарня. Калгасьнікі абавязаліся датэрмінова здаць збожжа дзяржаве па цьвёрдых пастаўках.

Заслуга калгасу ў тым, што ён на справе **ТЭМПЫ СПАЛУЧЫЎ З ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦЮ** ўборкі.

Арганізован падбор каласоў, якія засталіся за касцом і жанцом. Каласы зьбіраюць спрача калгасьнікаў і камсамольскай ячэйкі і піянэрскі атрад. Ні адзін сноп не пакідаўся на ноч у полі ня складзеным у бабкі.

Усе жнявяркі працуюць з зерноўлавіцелямі. Калгас прыступіў да ўборкі лёну. Ужо вырвана 12 га.

СІЛА УЛІКУ

Першая брыгада (брыгадзір т. І. Кухароў) калгасу **«Прамень»** спаборнічае з брыгадай № 2 (Горацкі раён).

Па сапаўборцы пярэшынства засталося за брыгадай Кухарава. Цяпер і ў ўборцы збожжавых брыгада № 1 ідзе наперадзе.

Чаму?

Тав. Кухараў добра разумее, якую сілу мае выразны калгасны ўлік. Кожны калгасьнік, кожная калгасьніца ў брыгадзе тав. Кухарава ведаюць, колькі ў іх працадзён і што яны на іх атрымаюць.

Брыгадзір падрабязна растлумачыў жанчынам нормы ручнога жніва і аплату іх у працадзнёх. Усё падлічана да аднэй сотай. Калгасьніца добра ведае, якая частка працадзён налічваецца за кожную ўбраную сотку га. І адсюль — неперавыкананьне норм. Калгасьніца яона сабе ўяўляе, што чым больш і лепш яна працуе, тым больш будзе ў яе працадзён, тым больш будзе ў яе даход.

Ня так працуюць брыгады №№ 2 і 3 (брыгадзіры Паштовы і Жалязьнёў).

Калгасьнікі ня ведаюць, колькі яны выпрацоўваюць. Улік зусім не наладжан. Зжатая плошча не абмяраецца.

Ня дзіва, што гэтыя брыгады зусім адсталі ад першай па ўборцы.

Д.

„НОВЫ КАНАТОП" ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НА 72 ПРОЦ.

НАРОЎЛЯ, 7.

У раённы цэнтр прыбыў чырвоны абоз са збожжам першага абмалоту. Здана 625 цэнтн. збожжа.

Калгас «Новы канатоп» здаў 102 цэнтн. збожжа, што складае 72 проц. гадавога пляну.

НА 58,5 ПРОЦ.

ХОЙНІКІ, 7. (Па тэлеграфу ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Партыйная арганізацыя на-ходу выпраўляе памылкі першых дзён уборкі і збожжапаставак.

Райком і палітаддзел праверылі ў сельсаветах і калгасах якасьць збожжа, якое накіроўваецца на прыёмачныя пункты. Сіламі райкому і палітаддзелу разгорнута вялікая масава-палітычная работа сярод аднаасобнікаў і ў выніку яны прынялі актыўны ўдзел у чырвоным абозе ў дзень індустрыялізацыі 6 жніўня.

Да 6-га жніўня аднаасобнікі выканалі жнівеньскі плян збожжапаставак на 33,7 проц.

За 6 жніўня паступіла 115.432 кгр. Жнівеньскі плян выканан раёнам на 58,5 проц.

Усяго па 6-та жніўня паступіла 245 тон.

Калгасы і працоўныя аднаасобнікі Назасёлкаўскага сельсавету выканалі гадавы плян збожжапаставак на 40,5 проц.

РАЗБАЗАРВАЮЦЬ ПЕРШЫ АБМАЛОТ

ВЕТКА, 6. (Па тэлеграфу)

У раёне наглядаюцца спробы разбазарыць першы абмалот. У калгасе «Прагрэс» з санкцыі ўпаўнаважаных РК і РВК першы абмалот выдан на авансы. Вінаватыя да адказнасьці ня прыцягнуты. Калгасам «Шлях сацыялізму» на авансы выдана 67 проц. першага абмалоту замест законных 10.

У ПАЛОНЕ СПАЖЫВЕЦКІХ НАСТРОЯЎ

ДУБРОЎНА, 7.

Кулацкая агентура, якая пралезла ў паасобныя калгасы, разбазарвае першы абмалот.

Калгасы імя Калініна, «Чырвоны пераможац» і «Чырвоны Кастрычнік» сваячасова скончылі абмалот са зжатай плошчы. Аднак, праўленьне гэтых калгасаў нічога не здалі дзяржаве, а разбазарылі першы абмалот.

Раённыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх мер супроць канкрэтных носьбітаў антыдзяржаўных кулацка-спажывецкіх тэндэнцый (Белта).

Аб зьмене п. 4 пастановы аб пляне паступленьня натурплаты за работы трактараў у 1932-33 г. па збожжавых культурах

Пастанова СНК БССР і бюро ЦК КП(б)Б ад 4-VII-1933 году

У зьмену п. 4 сваёй пастановы «Аб пляне паступленьня натурплаты за работы трактараў у 1932-33 г. па збожжавых культурах» («Зьвязда», 1933 год № 155), СНК БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

устанавіць, што збожжа, якое атрымліваецца МТС ад калгасаў у парадку натурплаты, падлягае ў першую чаргу здачы дзяржаве з 5 процантным адлічэньнем ад натурплаты на снабжэньне рабочых, прэміраваньне трактарыстаў робіцца поўнасьцю пасьля выкананьня МТС месячнага пляну здачы дзяржаве па натурплаце.

Адлічэньне ў разьмеру 5 проц. робіцца як ад разьмеру плану, так і ад лішкаў, здаваемых дзяржаве звыш плану.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД. Сакратар ЦК КП(б)Б ГІНАЎ.

НІ АДНАГО КОЛАСА НЕ ПАКІНУЦЬ У ПОЛІ

Уборка жыта першай брыгадай у калгасе «1 мая» (Войтаўскі сельсавет, Магілеўшчына).

КАЛІ ЗА ЖНЯВЯРКАЙ СЯДЗІЦЬ ВОРАГ...

ЕЛЬСК. (Ад нашага карэспандэнта).

Раён уступіў у масавую ўборку. Да 1-га жніўня калгасы ўбралі **32,4** проц. азімых, аднаасобнікі — **19,5.**

Паасобныя сельсаветы зжалі да 1-га жніўня звыш **70** проц. азімых (імя Розы Люксембург, Мяленкавіцкі і г. д.).

Ёсьць, аднак, ня мала і такіх сельсаветаў, дзе ўборка пастаўлена пад пагрозу. **РЭМІЗАЎСКІ** сельсавет, напрыклад, выканаў плян уборкі толькі на... **0,2** проц.

Аб чым сьвядчаць перныя ўрокі масавай уборкі?

Перш за ўсё аб **ДРЭННЫМ,** часамі проста злачынным выкарыстаньні ўборачных машын у цэлым радзе калгасаў. Пасьля жнявярак застаецца шмат нязжатых каласоў.

Кулацкае ахвосьце чапляецца за гэты факт і распальвае антымэханізатарскія настроі, імкнецца дыскрэдытаваць машыны.

— Бачыце, на нашых палёх машыны працаваць ня могуць, — і кулак паказвае на нязжатыя патаптаныя каласы. А справа вось у чым.

Недабіты вораг прабраўся да жнявяркі, пралез у рады машыністаў і сьвядома псуе машыны, каб сарваць уборку.

У калгасе імя Леніна **ДАПУСЬЦІЛІ ДА ЖНЯВЯРКІ КУЛАКА** Стоцкага (у мінулым раскулачанага). Стоцкі хутка прыклаў свае рукі да калгаснай машыны. Па-першае, зьняў зерноўлавіцель, па-другое, напсаваў хадавое кола. Жнявярка стала.

Пад уплывам кулацкай агітацыі ў раёне са жнявярак зьнімаюцца зерноўлавіцелі.

Раённыя арганізацыі не выкрываюць маневраў кулацкага ахвосьця, ня бачаць, што ў радзе калгасаў да машыны прабраўся вораг.

Не вядзецца ніякай барацьбы і з кулацка-спажывецкімі настроямі. Кулацкая агентура, пралезшая да кіраўніцтва ў паасобных калгасах, злачынна разбазарвае збожжа.

Старшыня калгасу «Чырвоны пушчавец» Казяцюў (па рэчы, партыец) раздаў на авансы ўвесь першы абмалот, — 900 кгр., а па абавязацельствах — нічога. Разбазарылі першы абмалот, пачала ня здаўны дзяржаве, і калгасы «Прыклад», «Бальшавік», імя Дзяржынскага і г. д.

Раённае кіраўніцтва, добра ведаючы аб гэтых вулках вылазках, **НЯ ПРЫМАЕ,** літаральна, ніякіх мер. Райком фактычна патурае кулацка-антысавецкім настроям.

І яшчэ адна, надзвычай сур'ёзная справа. Ігнаруецца важнейшая задача — якасьць збожжа, якое здаецца дзяржаве.

Першага жніўня на прыёмачны пункт было дастаўлена каля 20 тон сырога, нікуды нягоднага збожжа.

Факты красамоўна даказваюць, што ельскае раённае кіраўніцтва **НЕ ЗМАГАЕЦЦА** за сваячасовую і высакаякасную ўборку і пастаўкі збожжа.

ЕЛЬСКІ.

Падарунак эскадрыльлю імя Кагановіча

Да дня авіяцыі—сабраць сродкі на пабудову эскадрыльлі

Учора на бягучы рахунак № 160-700814 паступіла:

Ад магілеўскага аддзяленьня Дзярж банку—67 руб. 25 кап., ад Менскай гаркасы—177 руб., ад інстытуту сацыяльнай гігіены—46 руб. 65 кап., ад санітарна-гігіенічнага інстытуту—117 руб. 75 кап., ад тэхнікуму сувязі —146 руб. 40 кап., ад лесазбыту — 267 руб. 20 кап., ад УРСР/92—450 руб., сталовай СНК—43 руб. 50 кап., базы хэбкатаў—42 руб. 10 кап., хімфарызаводу—300 руб., Наркамправы 67 руб., Менскай канторы БАКТ —432 р. 39 кап., цягельні № 3 — 141 руб. 77 кап., фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык»—342 руб., цягельні № 1—341 руб., калектыву рэдакцыі «Орка»—99 руб., ад цэнтральнага дзіцячага ільспансэру—127 руб. 56 кап., ад працаўнікоў мікраб. інстытуту—139 руб., ад МК дзяржбанку — 175 руб., ад арцелі «Перамога» — 150 руб., ад ЗРК АДПУ—831 руб. 50 кап. Усяго за ўчарашны дзень паступіла 3.994 руб., а з першага дня —174.043 руб.

Зусім недапушчальна, што да гэта га часу няма паступленьняў з раёнаў. У першую чаргу гэта датычыць **Віцебску, Магілева, Воршы.** Слаба разгортваецца работа і ў Менску. Зусім відавочна, што пры такіх тэмпах збору сродкаў, якія ёсьць зараз, у наяўнасьці простая пагроза, што пастаўленая задача да 18 жніўня закончыць збор сродкаў—ня будзе выканана.

Зусім слабы ўдзел у гэтай кампаніі прымае друк. Рад раённых газэт (Магілеўская, Аршанская, Полацкая і інш.) зусім не разгарнулі на сваіх старонках кампаніі за пабудову эскадрыльлі. Час, які застаўся да дня авіяцыі — 18 жніўня, павінен быць максымальна скарыстаны для таго, каб поўнасьцю закончыць збор сродкаў.

Уносяць і выклікаюць:

* Калектыў супрацоўнікаў беларускага дзяржаўнага гістарычнага музэю ў ліку 10 чалавек уносіць сабраныя на пабудову эскадрыльлі імя Кагановіча 31 руб. і выклікае паступныя ўстановы: Наркамасьветы, Беларускую Акадэмію Навук, Цэнтрархіў БССР, музэй рэвалюцыі і сэктар культуры і навукі Дзяржпляну.

* Гэрой першай пяцігодкі і лепшы ўдарнік, якія адпачываюць у плывучым доме адпачынку на параходзе «Чэкіст» (4 рэйс), як толькі прачыталі ў «Зьвязьдзе» аб выкліку рабочых і калгасьнікаў Гомельшчыны на збор сродкаў у фонд пабудовы эскадрыльлі імя тав. Кагановіча, адказалі 100-проц. падпіскай у суме 141 руб.

Нільвіскі.

* Рабочыя фабрыкі імя Сталіна (Рагачоў) сабралі 323 руб. і выклікалі райкамбінат.

* Рабочыя гаражу СНК пастанавілі адлічыць 1 проц. свайго заработку ў фонд пабудовы эскадрыльлі.

М. Горкі

Аб выхаваньні праўдай

Ілжывасьць буржуазнай, быццам «гуманітарнай»—г. зн. чалавекалюбівай—культуры выяўлена ў наш час зусім цынічна і бясспрэчна. Усе зьявы сацыяльнага сьвету ствараюцца жыцьцёвай дзейнасьцю людзей,—сіла гэтай жыцьцёвай дзейнасьці выяўляе і бесчалавечны сэнс зьяў, скрыты «законамі» і ласкавымі фразамі гуманістаў. У нашы дні толькі ідыёты і «машэньнікі пяра» здольны сьцьвярджаць, што чалавекалюбства сумяшчальна з карысьлівасьцю—асновай буржуазнага грамадзтва, «душой» яго. «Гуманізм» буржуазіі практычна выявіўся амаль выключна ў адчыненьні больніц—рамонтных майстэрань для чалавечага арганізму. Вядома, што чым больш беражна адносіцца да матар'ялу,—тым менш ён псуецца, тым больш дае карысьці. Да чалавека, як матар'ялу эксплёатацыі, як да рабочай сілы, карысьлівая буржуазія заўсёды адносілася па-ідыёцку бязьлітасна і, супроць сваіх правіл,—не «эканомна». Больніцы зусім ня значылі і ня значаць, што камандуючая кляса турбуецца аб ахове здароўя працоўнага народу, аб стварэньні такіх умоў жыцьця, якія ахоўвалі-б працоўны народ ад захворваньняў, ад заўчаснага высіленьня, ад заўчаснай сьмерці. Выдаткі на некі сапсаваных людзей буржуазія ў сто раз пакрывае даходамі ад выробу безьлічы мэдычных сродкаў, прэпаратаў, інструмантаў і г. д. Хваробы зьяўляецца для крамнікаў крыніцай нажывы.

Аб барацьбе з напісьменнасьцю, з вуцтвам «народу» буржуазія клапацца пастолькі, наколькі гэта задальвала яе патрэбнасьць у пісьменных навольніках і абаронцах яе ўлады. Яна, вядома, скараціла-б жабрацкія «свае траты» на асьвету працоўнага народу, калі-б тэхніка магла выробляць з жалеза лёкаяў, паліцэйскіх і розных дробных служачых. У далейшым яна, мабыць, заказала-б сваім тэхнікам нарабіць папоў ад рэлігіі і філёсофіі з бляхі. Калі ў такі апарат уставіць грамафонную пласьцінку, насьпяваную банкірам або паважным дзеячам ваеннай прамысловасьці, апарацік гэты будзе выгодна адрозьніваццца ад жывых папоў сваёй непатрабоўнасьцю і стойкасьцю ў часе. Праводзячы карысную работу ў гэтым кірунку, можна-б папоўніць парляманты дэпутатамі, пабудаванымі з дубу, або шытымі з лыкаў,—гавораць, што патрэбна, а есьці ня просяць. І тады падакучлівую жывую чалавечую дробязь, накшталт рабочых, сялян, можна будзе лікам скараціць, а то і зусім,—з-за непатрэбы—зьнішчыць якім-небудзь гуманым прыёмам.

Сказанае гучэла-б, як сумная фантазія, калі-б мы ня ведалі, што спробы фабрыкацыі жалезных рабоў—«робатаў»—ужо пачаты і некаторыя з гэтых спроб вельмі ўдалы: нядаўна буржуазная прэса Эўропы паведамляла, што ў Н'ю-Ёрку дэманстравалі жалезнага паліцэйскага, а недзе выдуман і пабудован мэханічны лёкай,—прыводзіцца ў рух электрычнасьцю і нават схільны да злодзейства.

Усё магчыма. Сьвет буржуазіі ня толькі стаў ілжывым, ён—псыхічна хворы. Яго прэса, крыніца ілжы, паклёпу, брудных плётак, садыскіх гісторый,—часта расказвае штосьці не равышаючае ўсякія сумныя фантазіі. Вось, напрыклад, што паведамляе адна з газэт:

Ніколі яшчэ колькасьць вар'ятаў ня была так вялікая ў Амэрыцы, як зараз.

Рост яе бязупынна адбываецца і ўлады сур'ёзна закланочаны барацьбой з гэтай нацыянальнай небясьпекай.

Адзін вядомы псыхіятр вылічыў, што, калі папырэньне душэўных захворваньняў будзе і надалей ісьці тым-жа тэмпам, праз 75 год палова ўсяго насельніцтва Злучаных Штатаў будзе сядзець у вар'яцкіх дамох, а другой палове прыдзецца працаваць на іх утрыманьне. Калі гэтае папурае прароцтва і некалькі перапавялічана, то ва ўсякім выпадку лічбы, якія ілюструюць рост душэўных захворваньняў за апошнія дзесяць год, указваюць на вельмі трывожнае становішча.

У 18 штатах колькасьць псыхічна хворых падвоілася паміж 1921 і 1931 г.

Н'ю-ЁРК страціў у 1931 г. 47 млн. даляраў на ўтрыманьне 73 тыс. вар'ятаў; параўнальна з 1921 годам гэта складае павялічэньне ў 350 проц.

У штаце Масачузэтс адна пятая падаткаў ідзе на ўтрыманьне прытулкаў для страціўшых розум».

Усё больш часта—і роўнадушна—паведамляецца аб росьце самагубстваў, асабліва ў Германіі, дзе кваліфікаваная інтэлігенцыя апынулася ў стане сапраўды безвыходным, сярод самагубцаў—прафэсары, адвакаты, судзьдзі, артысты, дактары, усе—людзі, на асьвету якіх буржуазія затраціла немалыя сродкі. З майго пункту гледжаньня самагубства—акт упоўнай меры законны: гэта—самасуд асобы, усьвядоміўшай злачынасьць сваёй дзейнасьці, або бязьдзей насьці. У Германіі людзі забіваюць сябе таму, што дзейнасьць—немагчыма, а бязьдзейнасьць пагражае жабрацтвам, зьнявагай, сьмерцю ад голаду.

Факты, якія агаляюць хваробы буржуазнага сьвету, бязьлікія, а разам з імі ўсё больш паразьліва выяўляецца ўбоства і нядатнасьць буржуазнай мысьлі, высіленьне інтэлектуальнай энэргіі сусьветных крамнікаў. Жыцьцё буржуазіі—бязупынны ланцуг бяссэнсных злачынстваў: буйнейшыя былі зроблены ў 30,48, 71 г. г. мінулага стагодзьдзя, пасьпелі крамнікі ўжо сёе-тое зрабіць і ў гэтым стагодзьдзі, зьбіраюцца арганізаваць сусьветную бойню, якая павінна зацямніць 14-18 г. г.

На прасторах ад берагоў Бальтыкі да Ціхага акіяну і ад берагоў Ледавітага акіяну да Закаўказьля і прадгор'яў Паміру,—робіцца вялікая і прыгожая сусьветна неабходная справа выхаваньня людзей праўдай калектыўнай працы. Я яшчэ раз звараччаю ўвагу чытачоў на будаўніцтва Беламорска-Бальтыцкага каналу, як на адзін з фактаў, якія навочна паказваюць посьпех нашай сыстэмы выхаваньня. Ворагі Саюзу Саветаў называюць працу сацыяльна-пакараных прымусовай. Гэта, вядома, у поўнай меры зразумелая мана асьлепленых клясавай варожасьцю, мана людзей, якім неабходна так ці інакш апраўдаць у сваіх вачох маладую сацыялістычную дзяржаву, якая ўсяляе ў іх страх. Потым гэта паклёпніцкая балбатня роўнадушных служак капіталістаў, балбатня дзеля кавалка хлеба. Гэтыя служкі добра ведаюць, што прымусовая праца для асуджаных і зьніволеных абавязкова ва ўсіх капіталістычных дзяржавах і ў тых самых безчалавечных формах, якія—да Кастрычніка—ужываліся на катарзе царскай Расіі, узбуджаючы тайнае і прывычна двуліпае абурэньне буржуазных гуманістаў. Гэтыя служкі не настолькі цёмныя, каб не зразумець істотнай розьніцы ў адносінах буржуазіі і пралетарыяту да «злачынцы». Створаных ёю-ж—буржуазіяй парушальнікаў яе законаў яна лічыць не апраўданымі, яна рашуча і назаўсёды выкідвае злачынцу са свайго асяродзішча, а некаторых каструе, як гэта заведзена ў ПАЗШ. Караючы, буржуазія помсьціцца.

Для пралетарскага суда злачынца—стварэньне буржуазіі і, у большасьці, вораг і рабочай клясы па цемнаце, па непаразуменьні. Зьнішчаючы нязначную колькасьць непапраўных толькі тады, калі іх клясавы інстынкт выражан асабліва яркі і бесчалавечна, калі сапраўды «чалавек—зьвер», пралетарыят-дыктатар з посьпехам перавыхоўвае масу сацыяльна-небясьпечных, зьмяняе якасьць, выяўляе і разьвівае сацыяльна каштоўныя здольнасьці адзінак. За 15 год з асяродзішча былых бясьпрытульных і «правапарушальнікаў» у нас у калёніях і камунах АДПУ выхаваны тысячы высока-кваліфікаваных рабочых і, бадай, не адна сотня аграномаў, дактароў, інжынэраў, тэхнікаў. У буржуазных дзяржавах факты такога роду немагчымы, там, наадварот, за нязначныя—параўнальна з дзейнасьцю буйнай буржуазіі—правапарушэньні ў турмах тінуць такія талі навітыя людзі, як, напрыклад, вядомы літаратар О. Генры. Зусім магчыма, што калі-б урад цара не забіў рэвалюцыянэра Мікалая Кібальчыча—у Расіі быў-бы вынайдзен самалёт на 20 гадоў раней, чым у Эўропе.

У будаўніцтва Беламорска-Бальтыцкага каналу было ўцягнута некалькі дзесяткаў тысяч людзей розна небясьпечных грамадзтву, клясава варожых дыктатуры пралетарыяту, будаўніцтву сацыялізму. У гэтай масе людзей пераважалі злодзеі, хуліганы, «кулакі», г. зн. закарпелыя ўласьнікі, эксплёататары сялянскай масы. Трэба прыпамятаць, што кулакі, гэта—тыя самыя «чужаеды», Разуваевы і Калупаевы, якіх так яркі і ўмела, з такім «грамадзянскім абурэньнем» малявала ліберальна-народніцкая дэмакратычная прэса і бэлетрыстыка. Зараз былыя дэмакраты, знаходзячыся ў эміграцыі, вішчаць і выюць падобна да сабак, страціўшых гаспадара,—аб горкім лёсе тых самых кулакоў і чужаедаў, ненавідзець якіх яны вучыліся,—ан ня вывучыліся,—у Глеба Ўсьпенскага, Салтыкава-Шчэдрына і іншых сумленнейшых настаўнікаў жыцьця. Выюць і вішчаць, маняць і паклёпнічаюць зарубежныя дэмакраты ўсіх партый і масьцей толькі таму, што не ўдалося разам з чужаедамі ўсіх велічынь прыняць пасільны ўдзел у эксплёатацыі рабоча-сялянскай масы.

Не ўдалося і ўжо ніколі ня ўдасца, бо кулак становіцца работнікам, а яны, эмігранты, хутка і магалоўна вымруць.

Як разьвіваўся па будаўніцтве Беламорска-Бальтыцкага каналу працес перавыхаваньня сацыяльна небясьпечных у сацыяльна карысных, якія прыёмы ўжываліся для гэтага? Арміі розна шаноўных правапарушальнікаў,

БЕЛАМОРСКІ КАНАЛ ГАТОЎ!
Параход «Чэкіст» праходзіць шлюзы.

шкоднікаў, ворагаў было сказана: не абходна злучыць каналам Белае мора з Бальтыцкім.

Вы павінны пабудаваць водны шлях даўжынёю 227 кілёмэтраў, вам прыдзецца працаваць у лясох, у балотах, узрываць гранітныя скалы, зьмяніць плынь вельмі бурных рэк, узьні маць іх воды шляхам шлюзаў на вышыню да 103 мэтраў. Трэба будзе правесьці зямляных работ звыш 20 мільёнаў кубамэтраў і вынуць грунту больш 10 млн. кубамэтраў. Нам трэба зрабіць усю гэту работу ў найкарацейшы тэрмін. Вы атрымаеце добрае харчаваньне, добрую спэцвопратку і абутак, добрыя баракі, у вас будуць клюбы і кіно. Апрача гэтага, урад нічога не абяцае вам. Ваша работа пакажа, чаго вы варты.

Армія будучых барацьбітоў з прыродай і арганізатараў яе сіл, неадпастайная сацыяльна, была, зразумела, розна настайна і па настроі. У папраўча працоўных лягерах АДПУ вучаць грамаце і палітграмаце. Чалавек—разумнік, глупства вельмі рэдка зьяўляецца якасьцю, залежачай ад яго арганічных асаблівасьцей, часьцей за ўсё ино—розультат клясавага гвалту буржуазіі. Сярод дзесяткаў тысяч знайшлося нямала такіх людзей, якія зразумелі глыбокае, дзяржаўнае значэньне прапанаванай работы. Людзям, фізычна здаровым, любячым і прывыкшым перамагаць супраціўленьні, захацелася «паказаць сябе». Шалёныя рэкі і балоты Карэліі, палі і лясы, засеяныя вялізарнымі валунамі, стыхійнай работай ледніку—тут ёсьць з чым змагацца. Знайшліся і людзі, якія ўжо цьмяна здагадваліся аб бяссэнсасьці барацьбы чалавека з чалавекам,—барацьбы, гвалтоўна навязанай ім усімі ўмовамі буржуазнага быту, здагадваліся аб бяссэнсасьці работы на капіталізм, які параджае галечу. Былі ў гэтай арміі шкоднікі, асуджаныя на тэрмін да 10 год. Адзін з іх, старык 60 год заявіў, калі яго судзілі: «Калі-б прыцілі ітэрвэнты, я адразу-ж далучыўся-б да іх». У мінулым ён выканаў шмат вельмі цяжкіх тэхнічных работ, стварыў сабе буйнае імя і багацьце. На яго словах: «жыў добра, толькі птушынага малака ня піў». Ён атрымаў 10 год, адбыў у лягеры два гады і вясной 33 году напісаў у сваёй аўтабіяграфіі: «У карэльскіх лясох, у бараку тэхнічных работнікаў, я зразумеў, што такое сапраўдная работа... Што такое інжынэр, маючы за сабой настойлівую, поўную энэргіі, ведаючую мэту сваіх намаганьняў—рабочую масу».

«... Шмат філёзофстваваць нават пры старасьці я ня ўмею, ідэя перавыхаваць людзей у лягерах працай—надзвычай здаровая і прыгожая. Што датычыць ня практычнага дастасаваньня, нихай паміма мяне раскажуць дзьве тысячы ўдарнікаў, вызваленых па нашым вучастку задоўга да тэрміну».

Такіх інжынэраў, як ён, аказалася яшчэ некалькі, яны праявілі «выключную самаадданасьць і энэргію» ў рабоце, адзін з іх адрэкамандован начальнікам работ такімі словамі: «Выключна працавіты і настойлівы ў рабоце. З грамадзкага боку праяўляў сябе ўсебакова. Ня гледзячы на інвалідасьць (адсутнасьць адной нагі), шырока практыкаваў абезды па вучастках, дзе талковымі палітычна-завостранымі выступленьнямі і асабістым прыкладам работы на мясцох узьнімаў ініцыятыву і энтузіязм лягернікаў у справе перавыкаваньня вытворчых заданьняў і ў падрыхтоўцы кадраў».

Само сабой зразумела, што ўсе гэтыя героі працы вызвалены датэрмінова. Але да гэтага яны на працягу амаль 500 дзён варочаліся ў гушчы тысяч «сацыяльна-небясьпечных», якім было вядома, што гэтыя інжынэры—«контрыкі». Аднак-жа, хоць і «контрыкі», а працуюць самаахвярна. Гэты факт ня мог ня ўзбудзіць зьдзіўленьня нават у людзях вельмі тупых, а зьдзіўленьне ўзбуджае жаданьне ведаць: чаму? На гэта пытань не адказвалі і тыя, хто сваімі паводзінамі выклікаў яго, і страшныя «чэкісты», якіх па гэтай рабоце тысяч было некалькі дзесяткаў.

Як працавалі кулакі? Вось, напрыклад, брыгада Падліпінскага 1-га вучастку, 32 кулакі. За апошнюю дэкаду мая дала рэкордную лічбу 256 проц. нормы вытворчасьці на мяккіх грунтох. Брыгада не пакідала свайго вучастку нават у моманты прыходу наступнай зьмены. Брыгада была зьнята з работы па простым распараджэньні начальніка вучастку.

Брыгада «Адказ на загад № 1» складаецца пераважна з кулакоў. Працавала на скальных работах 6-га вучастку. Выконвала 130-150 проц. нормы. За высокія вытворчыя паказальнікі была прэміявана і запосена ў чырвоную працоўную кнігу.

Такіх брыгад было дзесяткі. Як пры рабоце ў лягерах адбіваўся на закарпелым уласьніку ўплыў калектыўнай працы, накіраванай на барацьбу са стыхійнымі сіламі прыроды? Ку лак лічыў сябе лепшым чалавекам вёскі, «арыстакратам» сярод мужыкоў, ён ня толькі ўмеў эксплёатаваць чужую працу, але і сам быў добрым работнікам у полі. Як грабежнік, ён бачыў сябе разумней і адважней тых, каго ён рабаваў. Ён прывык ненавідзець лодыраў, гультаёў, ён лічыў так, калі бедны, значыць—дурны, значыць дрэнны. І вось ён, самалюбівы, гапарысты чалавек пастаўлен ва ўмовы, якія паказалі яму, што лодыры, гультаі, зладзеі і ўсякі бесшабашны, анархізаваны народзец здольны працаваць лепш за яго. На яго вачох былыя лодыры, правапарушальнікі, валацугі, якіх ён ненавідзеў усёй сілай пянавісьці ўласьніка, становяцца кваліфікаванымі рабочымі, брыгадзірамі, арганізатарамі працы і што некаторыя з іх ужо кіруюць яго сілай, і,—галоўнае,—кіруюць таму, што зразумелі тэхніку працы лепш, чым ён, «гаспадар», вясковы князёк. Гэта не магло ня ўдарыць кулака па яго «душы», гэта ўзбудзіла яго самалюбства і прымусіла яго ўступіць у спаборніцтва з людзьмі, якіх ён ненавідзеў, да якіх адносіўся з пагардай.

Сярод гэтых людзей былі многія сотні такіх, якія адмовіліся працаваць, заявіўшы: «рабеце з намі што хочаце, а працаваць ня станем». Яны зранку да вечара валяліся на нарах баракаў, разводзячы ў іх грязь і не жадаючы нават падмесьці падлогу. Гарланілі песьні, гулялі ў самадзельныя карты, біліся адзін з другім. Часамі, ад нуды, ім авалодвала шаленства, яны ламалі нары, білі шыбы. Пасьля такіх бунтаў да іх зьяўляўся хто-небудзь са «страшных чэкістаў». Таварышы папярэджвалі яго: «Глядзі, будзь асьцярожней, могуць забіць». «Нічога»—таварыў ён і ўлазіў у гняздо двуногіх вос і авадоў. Яго сустракалі лаянкай, сьвістам, яму крычалі: «Не ўгаворыш, ня будзем працаваць».

І тут пачынаўся той самы «прымус», аб якім так азлоблена гучна і ілжыва крычыць уся буржуазія, усе крамнікі на чале з лодырамі і князем хрыстовай рымска-каталіцкай царквы, прапаведуючым «любоў да людзей» дзеля атрыманьня з іх «лепты». На самой справе «прымус» людзей, анархізаваных клясавым грамадзтвам, зводзіцца да прасьцейшага азнаямленьня іх з праўдай,—з тэй страшнай праўдай, ахвярай якой гэтыя людзі зьяўляюцца.

— Што-ж, хлопцы, ня хочаце працаваць? Працуюць «контрыкі», працуюць людзі, якія былі горшымі і больш шкоднымі за вас, а вы парушылі дарма есьці працоўны хлеб рабочых і сялян, гаспадароў краіны Саюзу Саветаў, вы хочаце жыць паразытамі, як мышы, папукі? Вы маладыя, у вас усё жыцьцё наперадзе,—вазьмецеся за розум, падумайце: чаму вамі выбран шлях правапарушальнікаў, злачынцаў? Рэдкія з іх думалі над пытаньнем: чаму? І вось іх прымушалі ставіць перад сабой гэта пытаньне. З тымі, якіх гэта пытаньне яўна хвалявала, вяліся асобныя гутаркі, з іх выхоўвалі прапагандыстаў праўды, агітатараў за сумленную працу. Праз малы час людзі, якіх не палохала вышэйшая мера пакараньня—сьмерць, пачалі баяцца папасьці на чорную дошку, баяцца, што ў газэце «Перакоўка» іх пакажуць у выгладзе «мокрых курэй».

Якія розультаты атрымала савецкая ўлада і грамадзкасьць пры дапамозе такога прымусу? Дробныя артыкулы, кім-бы яны ня былі напісаны, ня могуць даць поўнага і яркага ўяўленьня аб тым, што зроблена на будаўніцтве Бел.-Бальт. каналу. Гэта дасьць толькі кніга і над ёю ўжо працуюць. А вынік гэтага артыкулу такі: выхавана салідная армія кваліфікаваных рабочых, знаёмых з гідратэхнічнымі пабудовамі, гэта армія пойдзе на работы па каналу Масква—Волга, па БАМ, на Камышынскую плацціну і іншыя грандыёзныя пабудовы, неабходныя нашай краіне.

Са «сьвету злачынцаў» выцягнуты і пастаўлены на ногі сотні талена вітых людзей, якою, напрыклад, зьяўляецца былая зладзейка, зараз таленавітая скульптарша.

Дзесяткам тысяч былых правапарушальнікаў даны правы грамадзянства, або скарочаны тэрміны пакараньня. Гэта даволі красамоўна і пераканаўча гаворыць аб тым, як карысна выхаваньне праўдай і якія добрыя розультаты дае яно.

1931 год



Надвоіцкі вадапад...

1933 год



Шлюзы Беламорска-Бальтыцкага каналу

Малюнак Вал. Мядзьведзева.

Пабудову Беламорска-Бальтыцкага воднага шляху, прадпрынятую па ініцыятыве тав. СТАЛІНА і адкрываючую шырокія пэрспэктывы для далейшага эканамічнага і культурнага разьвіцьця і ўздыму Карэліі і ўсёй поўначы СССР—лічыць закончанай.

Стварэньне такога магутнага транспартнага шляху, аўльнай працяжнасьцю з падыходнымі каналамі ў 227 кілёмэтраў, ад Анескага возера да Белага мора, з разьмешчаным на ім комплексам складаных гідратэхнічных пабудоў, аўльнай колькасьцю ў 128, з якіх—шлюзаў 19, плацін 15, водаспускаў 12, дамб 49 і штучных каналаў 33,—забясьпечвае ўстанаўленьне непасрэднай воднай сувязі паміж Бальтыцкім морам і Савецкай поўначчу. (З пастановы СНК СССР ад 2 жніўня 1933 г.).

ДОБРАЯ ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ—АДЗНА КА ДОБРАЙ РАБОТЫ ПРАДПРЫЕМСТВА

(Гутарка з народным камісарам лёгкай прамысловасьці СССР тав. Любімавым)

У гутарцы з прадстаўнікамі друку народны камісар лёгкай прамысловасьці СССР тав. Любімаў перад выездам у Віцебск для азнаямленьня з работай лёгкай прамысловасьці гораду заявіў наступнае:

Задачай маёй паездкі зьяўляецца азнаямленьне з работай лёгкай прамысловасьці Беларусі, выразнаўленьне сумесна з ЦК КП(б)Б і СНК БССР раду пытаньняў і прыняцьця мер па забесьпячэньню выканаўньня вытворчай праграмы лёгкай прамысловасьцю Беларусі. Гэта ў асаблівасьці неабходна зараз, бо ў першым паўгодзьдзі лёгкая прамысловасьць Беларусі працавала зусім нездавальняюча, выканаўшы план па выпуску прадукцыі на 84,1 проц. пры значным недавыкананьні якасных паказальнікаў па вырабе пасьцільнасьці працы, якасьці прадукцыі.

Трэба адзначыць, што паведаныя намі прадпрыемствы гораду Менску працуюць, як відаць, лепш за прадпрыемствы іншых гарадоў Беларусі. Гэта швейная фабрыка «Кастрычнік», якая выканала план на 100 проц., гарбарня «Баяншвейк», таксама поўнасьцю выканаўшая праграму, частковa менская абутковая фабрыка, якая выканала план на 94 проц.

БССР за апошнія гады зусім зьмянілася. У Беларусі вырасьлі новыя галіны прамысловасьці, у тым ліку і лёгкай, напрыклад, швейная, якая абслугоўвае ня толькі Беларусь, а вывозіць каля 90 проц. сваёй прадукцыі ў іншыя вобласьці Савецкага Саюзу. Вялікае разьвіцьцё атрымала трыкатажная прамысловасьць. Такое прадпрыемства, як віцебская фабрыка імя КІМ, зьяўляецца буйнейшай фабрыкай ня толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе. Тое самае можна сказаць, і аб гарбарна-абутковай прамысловасьці.

Посьпехі і разьвіцьцё народнай гаспадаркі БССР для мяне асабліва наглядны і паразьлівы паколькі ў 1917 годзе мне прыходзілася працаваць у Беларусі, як аднаму з удзельнікаў лютаўскай рэвалюцыі ў Менску і на Заходнім фронце (тав. Любімаў зьяўляўся першым старшынёй Менскага савету рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў і намесьнікам старшыні фронтавога камітэту Заходняга фронту). Тады нам прыходзілася апірацца толькі на нязначныя кадры рамесьленных рабочых і на чыгуначнікаў. Зараз-жа ў Савецкай Беларусі мы маем шматлікныя кадры прамысловых рабочых, якія зьяўляюцца героямі сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі на мяжы з капіталістычным сьветам, расадзнікамі і посьбітамі савецкай культуры на мяжы з Захадам і аплотам пралетарскай дыктатуры.

Тры прадпрыемствы, якія мне прышлося бачыць у Менску, зьяўляюцца, як і ўся прамысловасьць Беларусі, новымі або азнаёмі панава ржавасьці мачымі і прадстаўляюць сабой якогул добра абсталяваныя, тэхнічна аснашчоныя, прыстасаваныя прадпрыемствы. Аднак, часамі по хапае пеўлікай заканчанасьці, якая-б надала больш культурны выгляд прадпрыемству. Часта да прыгожага завоцкага будынку прыляпляюць пеўлікія хібоўкі, якія псуюць агульнае ўражаньне сацыялістычнага прадпрыемства. Таксама мала ліпчэ чыстаты, якаўнасьці, часам сьмецьцё ў будынках і ва дварох фабрык засьмечвае новыя прыгожыя фабрычныя будынкі. І патрэбна зусім мала для таго, каб выправіць гэтыя недахопы. Гэта характарызуе падбайныя адносіны кіраўнікоў прадпрыемстваў да так званых «дробязяў».

У адносінах амаль усіх прадпрыемстваў, на якіх мне ўдалося пабываць у Менску, проба сказаць, што можна ім вельмі многа пакадаць у адносінах якасьці прадукцыі. Паляпшэньне якасьці — адно з асноўных патрабаваньняў, якія прад'яўляе нам партыя і ўрад. Часта план па колькасьці выконваецца за кошт якасьці прадукцыі. А добрая якасьць — ёсьць адзнака добрага прадпрыемства. Добрая якасьць — адзнака добрай работы. Хібы ў якасьці прадукцыі асабліва рэзка і наглядна выяўляюцца на абутковай фабрыцы імя Кагановіча. Кіраўніцтвам і ўсяму калектыву фабрыкі патрэбна многа шаграцаваць, каб паставіць на належную вышыню работу па якасьці прадукцыі.

Швейная фабрыка «Кастрычнік», гарбарня «Баяншвейк» маюць у адносінах якасьці значныя дасягненьні, але ўсё-ж ім патрэбна многа і многа працаваць над павышэньнем якасьці сваёй прадукцыі.

Пры аб'ездзе асноўных рабнаў і прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці іншых гарадоў Беларусі можна будзе паўней скласьці ўражаньне і дэтальней, канкретней адзначыць рад хібаў і намеціць мерапрыемствы, якія неабходны для палепшэньня работы лёгкай прамысловасьці БССР. Гэту работу мы мяркуем прарабіць разам з ЦК КП(б)Б і СНК БССР 8-га жніўня на спэцыяльнай нарадзе актыву лёгкай індустрыі.

Тав. Любімаў на прадпрыемствах Віцебску і Гомелю

6 жніўня народны камісар лёгкай прамысловасьці СССР т. ЛЮБІМАЎ разам з сакратаром Віцебскага гаркому КП(б)Б т. ЖУРАЎЛЕВЫМ, старшынёй гарсавету т. БАСКІНЫМ і намесьнікам Наркамлёгпраму БССР т. КАЦАМ наведаў буйнейшыя прадпрыемствы Віцебску—«СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», ІМЯ КІМ, ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН.

На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» адбылася нарада адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, на якой т. Любімаў выступіў з прамовай. Удзень т. Любімаў прысутнічаў на нарадзе гаспадарнікаў пры гаркоме КП(б)Б, дзе таксама выступіў з прамовай аб становішчы і задачах віцебскай прамысловасьці.

Увечары 6 жніўня тав. Любімаў выехаў у Гомель, дзе таксама наведаў буйнейшыя прадпрыемствы, у тым ліку мэханізаваную гуту, фабрыку «Вэзуві» і іншыя. Вечарам 7 жніўня тав. Любімаў выехаў у Менск.

Чацьверты тыраж пазыкі „Чацьвертага завяршальнага“ адбудзецца ў БССР

Першага-другога настрычніка гэтага году ў БССР адбудзецца чацьверты тыраж пазыкі «4-га завяршальнага году першай пяцігодкі».

У сувязі з гэтым Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржрэдыту і ВЦВАД справе пры ЦВК БССР абвясьціла конкурс на лепшую рэалізацыю пазыкі 2-ой пяцігодкі, збор узносаў па падпісцы і выканаўньне фінплану па ўсіх відах паступленьняў. Тыраж адбудзецца ў тым раёне, які поўнасьцю і першым рэалізуе пазыку сярод усіх груп насельніцтва і выканае фінплан III кварталу. (Белта).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

АРГАНІЗАВАЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ ПАРТЫЙНА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ З КАНДЫДАТАМІ І СПАЧУВАЮЧЫМІ

Замацаваць вынікі чысткі

БАРЫСАЎСКІ раённы камітэт партыі правёў вялікую работу ў галіне пад рыхтоўкі ўсёй раённай арганізацыі да чысткі. У сельскіх ячэйках былі арганізаваны кароткатэрміновыя курсы па прапрацоўцы праграмы і статуту партыі і яе асноўных пастаноў. Гэтымі курсамі былі ахоплены звыш 2-х тысяч камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных калгаснікаў-актывістаў. Наладжаны больш-менш рэгулярныя заняткі сеткі школ і гурткоў партыйнай вучобы. У горадзе былі арганізаваны курсы па перападрыхтоўцы гарадзкіх прапагандыстаў на 60 чалавек, праводзяцца рэгулярныя заняткі з раённым партактывам.

Як вынік гэтага — значна ўзмацніпася цяга з боку камуністаў і беспартыйнага актыву да павышэння свайго палітычнага ўзроўню. Калі зімовай партыйнай вучобай было ахоплена 1.050 чалавек і 367 кандыдатаў партыі, то зараз гэтымі формамі вучобы ахоплена 1.595 чалавек, або 95 проц. усёй партыйнай арганізацыі. Беспартыйных рабочых і калгаснікаў займаецца 762 чал.

У галіне прамысловасці ёсьць зрухі ў выкананьні прамфінпляну па ўсіх паказальніках і па паляпшэньні якасьці прадукцыі. Так па камбінаце «КАМІНТЭРН» у цэлым і па асобных яго звяньнях, дзякуючы разгорнутай партыйна-масавай рабоце за перыяд падрыхтоўкі да чысткі і ў часе самой чысткі, прамфінплян увесь час перавыконваецца. Лесапільны цэх сваю праграму выканаў за чэрвень на 104 проц. капдачны — 103 проц., мэблявы — 114 проц. Праграма па экспарце выкананa на 114 проц. Пераходны сьцяг РК КП(б)Б за выкананьне прамфінпляну можна і зараз трымаецца рабочым капэтыцвам камбінату пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі.

Па ЧЫРВОНА-БЯРЭЗІНСКІМ камбінаце і па заводзе імя ДОМБАЛЯ была амаль сыстэматычнае недавыкананьне прамфінпляну, а ў часе чысткі і зараз планы перавыконваюцца (завод імя Домбаля — 104 проц., Чырвоная Бярэзіна — 102 проц.).

Чыстка партыі асабліва ўскалыхнула ВЯСКОВЫЯ партыйныя арганізацыі і беспартыйны калгасны актыў. Дзякуючы шырокай мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі вакол важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы, — большавікі Барысаўшчыны першымі у БССР дабіліся выкананьня пляну сорыва папараў пад азімыя (на 14-VI — 102 проц., а на 5-VII — 108 проц.). У доўным пасьпяхова прашла праполачная кампанія і падрыхтоўка да ўборачнай як па сацыялістычнаму сэктару, так і сярод аднаасобнікаў.

Барысаўская арганізацыя падыходзіць да канца сваёй чысткі. Па прадстаўленых матар'ялах ячэйковых праверачных камісій на 25 ліпеня прашло чыстку 74,6 проц. усёй раённай арганізацыі — 691 член і 352 кандыдаты партыі. Пераведзена з членаў у кандыдаты 54 чалавекі або 6,06 проц., у спачуваючыя — 54 чалавекі або 15,3 проц.

Чыстка Барысаўскай як і іншых партыйных арганізацый пацьвердзіла усю правільнасьць і своячасовасьць чысткі нашых радоў. Камісіямі па чыстцы ў цэлым радзе ячэек вычышчаны сапраўды «КЛЯСАВА-ЧУЖЫЯ І ВАРОГІЯ ЭЛЕМЭНТЫ, якія АШУКАНЧЫМ ШЛЯХАМ ПРАБРАЛІСЯ Ў ПАРТЫЮ І ЗАСТАЮЦЦА ТАМ ДЛЯ РАЗЛАГАНЬНЯ ПАРТЫЙНЫХ РАДОЎ» (з пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы).

Чыстка ўскрыла людзей, якія на справе заяўляюцца дэгурушнікамі, жывуць ашуканствам партыі, хаваюць ад яе свае сапраўдныя імкненьні і пад прыкрыцьцём хлусьлівага прысягання ў вернасьці партыі працуюць супраць на справе палітыку партыі. Камісіі ў цэлым радзе выпадкаў сустрэлі выхадцаў з іншых партый, якія яшчэ не перавыхаваліся як члены камуністычнай партыі, а продаўжаюць стаяць на сутнасьці на пазыцыі варожых нам ідэалёгій, на пазыцыях дробнабуржуазных партый. Так у ячэйцы працасьветы ў часе чысткі былі выкрыты былыя бундаўцы - настаўнікі БЕЛКІН, КЛЯБАНАВА, якія фактычна не пералі яшчэ з бундаўскімі традыцыямі, не вялі барацьбы з апазыцыянтамі і рознага роду нацыянал-шавіністычнымі выпазкамі. Дырэктар падтэхнікуму да ўступленьня ў партыю скрыў тое, што ён быў эсэрам да 1917 году.

Вось узорчык заўзятага бундаўца ЛЕВІНА (адказны сакратар яўрэйскай сторонкі газ. «Большавік Барысаўшчыны»), якая з 1905 па 1918 год была ў яўрэйскай нацыяналістычнай партыі «СС» з 1918 па 1920 год у радах бунду, а з 1920 году ў КП(б)Б. За час перабываньня ў радах нашай партыі Левіна ня толькі не выкрывала сутнасьці бунду, а наадварот, ідэалізавала яго. 6 ліпеня гэтага году Левіна, як адказны сакратар яўрэйскай старонкі, зьмясьціла ў газэце «Большавік Барысаўшчыны» артыкул пад назвай «Сацыял-фашысцкая дзейнасьць бунду». У артыкуле не паказана дзейнасьць бунду на працягу ўсёй яго гісторыі, яго барацьбы супроць Леніна і большавікоў. Левіна ў артыкуле робіць упор на контр - рэвалюцыйную дзейнасьць бунду толькі ў апошнія 18 год у Амэрыцы і Польшчы. Поўнасьцю замаскіраваць контр - рэвалюцыйную дзейнасьць бунду да Кастрычніка ў царской Расіі і пасьля Кастрычніка ў СССР і асабліва ў БССР. На бюро РК КП(б)Б у часе абгаварэньня гэтай справы Левіна ня прызнала сваёй памылкі, а яшчэ больш паглыбіла яе.

Калі-б і далей так прааналізаваць матар'ялы праверачных камісій, то мы знойдзем шмат выпадкаў, калі былі выкрыты «КАР'ЕРЫСТЫ І БЮРАКРАТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ, ЯКІЯ СКАРЫСТОЎВАЮЦЬ ПРАБЫВАНЬНЕ Ў ПАРТЫІ І СЛУЖБУ Ў САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ ДЛЯ СВАІХ АСАБІСТЫХ ШКУРНІЦКІХ МЭТ, ЯКІЯ АДАРВАЛІСЯ АД МАС І ПАГАРДЖАЮЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЬНЯМІ МАС ... ЯКІЯ МАРАЛЬНА РАЗЛАЖЫЛІСЯ І СВАІМІ АНТЫПАРТЫЙНЫМІ ПАВОДЗІНАМІ ГАНЬБЯЦЬ АЎТАРЫТЭТ ПАРТЫІ, ГАНЬБЯЦЬ СЬЦЯГ ПАРТЫІ». Ну чаго варт такі напрыпад «камуніст», як ГАНФАРД (ячэйка Барысаўскага ЦРК), які зьдзяўлёўся, чаму гэта так доўга трымаюць пры чыстцы адзнаго з камуністаў (40 хвілін). Адносна сябе Ганфард думаў, што яго будуць трымаць 5 хвілін. Калі-ж дашла чарга да Ганфарда, яго прапрымалі больш гадзіны, прычым выступілі 7 таварышоў і выкрылі сапраўдны яго твар. Ганфард—зяць былога мясьніка-пазбаўленца, мае сувязь з ім і зараз. Калі райфінінспэктар эпіс-

Увагу кандыдату і спачуваючаму

Асьвятляючы ход чысткі ў буйнейшых партарганізацыях Менску—на заводзе «Большавік» і на фабрыцы «Кастрычнік», «Зьвязда» паказала, што адным з найбольш слабых месц гэтых калектываў зьяўляецца палітыка-выхаваўчая работа. Аб гэтым асабліва ясна сказалі літбы пераведзеных з членаў у кандыдаты і з кандыдатаў у спачуваючыя ў рэзультаце чысткі.

З таго часу, як закончана чыстка на «Большавіку» і «Кастрычніку», прайшло каля месяца. Што зроблена за такі вялікі тэрмін для рэалізацыі прапаноў праверкомаў, для перабудовы партыйна-выхаваўчай работы?

На заводзе «Большавік», дзе ў групу спачуваючых пераведзены 23 таварышы, партыйны калектыў да гэтага часу не разгарнуў сярод іх ніякай работы. Група спачуваючых не афармлена. Сярод пераведзеных у спачуваючыя не праводзяцца ні гутаркі, ні чыткі газэт. Таварышы не атрымалі ніякіх грамадзкіх нагрузак.

Сакратары парткалектываў не прыступаюць да разгортвання партыйнай работы сярод пераведзеных у групу спачуваючых і ў кандыдаты партыі, чакаюць нейкіх новых дырэктыў. Сакратар парткалектыву заводу «Большавік» тав. **Гелер** тлумачыць адсутнасьць работы са спачуваючымі тым, што ў яго няма ніякіх дырэктыў ад гарадзкога камітэту партыі. Такім чы нам выходзіць, што пастанова ЦК УсеКП(б) і прамова тав. Кагановіча яго не задавальняюць.

Такое-ж становішча і з пераведзенымі з членаў у кандыдаты партыі. На заводзе «Большавік» ёсьць 25 чалавек, у часе чысткі пераведзеных у кандыдаты. А ўсяго на заводзе цяпер 43 кандыдаты. Грамадзкія нагрузкі маюць толькі 14 чалавек, а з ліку пераведзеных у кандыдаты партыі—толькі 7 чалавек. Размеркаваньне на грузак насіла фармальны характар, ня ўлічвалася агульная і палітычная падрыхтоўка таго ці іншага таварыша. Пераведзенаму за палітычную няпісьменнасьць з членаў у кандыдаты партыі тав. **Мінліну**, партыйны калектыў даручае непасільную яму нагрузку агітатара.

Зусім дрэнна стаіць справа з арганізацыяй летняй партвучобы. На фабрыцы «Кастрычнік» палітвучоба пастаўлена больш-менш здавальняюча і кожны кандыдат пачаў ужо наведваць палітгурток, а на заводзе «Большавік» аб летняй партвучобе яшчэ ня думаюць.

Большасьць таварышоў, пераведзеных у кандыдаты партыі і ў групу спачуваючых, за невялікім выключэньнем тых, якія апэлююць, лічаць пастанову камісіі па чыстцы зусім правільнай. Рабочы заводу «Большавік» тав. **Капялевіч І.**, член партыі з 1931 г., пераведзены за палітычную няпісьменнасьць у кандыдаты, лічыцца на вытворчасьці адным з лепшых ударнікаў, але палітычнае разьвіцьцё яго такое нізкае, што ён ня можа разабрацца ў самых элемэнтарных пытаньнях статуту і праграмы партыі і ў багучай палітыцы. Ён цалкам згодзен з тым, што яшчэ ня можа быць членам партыі. Зараз тав. Капялевіч узяў абавязацельства актыўна наведваць палітшколу з тым, каб атрымаць неабходныя для камуніста палітычныя веды.

Але, як гэта ні дзіўна, кіраўніцтва парткалектыву пакуль што не дае магчымасьці выканаць узятыя абавязацельствы. На заводзе няма палітгуртка. Ня гледзячы на просьбы тав. Капялевіча аб прымацаваньні да яго падрыхтаванага камуніста, нікога да яго не прымацоўваюць. У партыйнай арганізацыі заводу такіх, як Капялевіч, шмат.

На фабрыцы «Кастрычнік» пераведзены ў кандыдаты партыі тав. **Гарэлік** просіць ад партыйнага калектыву большай увагі да сябе, як да кандыдата партыі. На фабрыцы ёсьць частка кандыдатаў партыі і спачуваючых зусім няпісьменных, і партыйны калектыў не клапоціцца аб тым, каб арганізаваць гурток па лік відацыі няпісьменнасьці. Тав. Гарэлік скардзіцца, што яму вельмі цяжка вучыцца ў палітгуртку, бо ён зусім няпісьменны.

Якія адсюль выцякаюць вывады?

Партыйныя калектывы заводу «Большавік» і фабрыкі «Кастрычнік» павінны ўзьняць партыйна-выхаваўчую работу сярод пераведзеных у кандыдаты партыі і ў спачуваючыя на такую вышыню, каб яны праз кароткі прамежак часу маглі поўнасьцю адпавядаць тым патрабаваньням, якія прад'яўляюцца да членаў нашай партыі. Неабходна зараз-жа аформіць групы спачуваючых, разгарнуць сярод іх партыйна-выхаваўчую работу (гутаркі, чыткі газэт, даручэньне грамадзкіх нагрузак і г. д.). Трэба па справе даць зразумець гэтым таварышом, што іх перавод ёсьць не партпагнаньне, а палітычнае выхаваньне.

Падароўскі.

Па сьлядох ненадрукаваных лістоў

У заметцы «Там дзе кіруюць шляпы» селькор Ліпа нам пісаў, што загадчык Ушніцкага райземаддзелу «камуніст» Гудзян п'янстваваў у кулака в. Антапольле, Сьлідчанскага сельсавету, Шурмеля С. (які выключан з калгасу), а таму ўзяў яго пад сваю абарону і скарыстаўшы свае правы даў загад праўленьню калгасу: зрабіць поўны разлік з Шурмелем і даць яму калгаснага каня для ўспашкі і бульбы для засеву агароду.

Ушніцкая РКК КП(б)Б паведамляе, што ўсе факты, указаныя ў допісу, адпавядаюць сапраўднасьці.

Заг. райва Гудзян за зрыў падрыхтоўкі да ўборачнай, за зрашчываньне з кулаком Шурмелем з работы зьнят і выключан з радоў КП(б)Б.

АБ ХОДЗЕ РАБОТ ПА ТЭРПЭНТЫНАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну здабычы жывіцы ў гэтым сезоне 6.018 тон і ўлічваючы сезоннасьць работы (май—верасень), ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанаўляюць:

1. Абавязаць Белхімлес (**тав. Зарэцкага**) забясьпечыць на працягу сезону своячасовае правядзеньне ўздымкі і збору жывіцы, не дапускаючы прагалу прыёмнікаў, вытварыўшы ў ліпені ня менш 9 ўздымак і 5 зборак, у жніўні — 9 здымак і 5 зборак і ў верасьні—7 здымак і 4 зборкі і гэтым самым поўнасьцю выканаць плян па здабычы і адгрузцы здабычы.

2. Прыняць да ведама заяву тав. Зарэцкага, што ўсе спэцыялісты тросту накіраваны на месца для апэрацыйнага і тэхнічнага кіраваньня работамі падсочкі і што пляны ў месячным разрэзе даведзены да кожнага РВК.

Абавязаць тав. **Зарэцкага** на працягу 2-х дзён давесьці падкладныя пляны да кожнага РВК і РК і направіць дэкады праверыць аб давядзень ні плану да кожнага рабочага.

3. Абавязаць сакратароў РК і старшынь РВК забясьпечыць падсочку поўнасьцю рабочай сілай, замацаваўшы яе на гэтай рабоце да канца сезону, катэгарычна забараніўшы скарыстань не яе на іншых работах, таксама забясьпечыць патрэбнай гужавой сілай для своячасовай дастаўкі жывіцы заводам.

4. Абавязаць БРК Саюзу Леса і сплаву (**тав. Зльпэрына**) разгарнуць культурна-масавую работу на падсочцы, укараняючы брыгадны мэтад працы, сацыяборніцтва і ўдарніцтва, папярэдзіўшы, што прафработа будзе адказваць у залежнасьці ад падняцця вытворчасьці і якасьці дабываемай жывіцы.

5. Абавязаць ОРС Лесбелу (**т. Госіна**) неадкладна забясьпечыць рабочых падсочкі прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі, згодна ўстаноўленых норм, а гужавы транспарт—фуражом, не дапусьціўшы ні ў якім разе перабояў.

6. Абавязаць сакратароў РК і старшынь РВК ажыцьцявіць апэрацыйны кантроль за работамі па падсочцы, пэрыядычна заслухоўваючы інфармацыі дырэктара Хімлесгасу і прарабаў Белхімлесу аб ходзе выкананьня пляну. Папярэдзіць сакратароў РК і старшынь РВК, што яны нясуць адказнасьць за выкананьне пляну па здабычы жывіцы нароўні з дырэктарамі і прарабамі Белхімлесу.

7. Улічваючы нездавальняючае становішча з візавымі кадрамі (прамайстрамі па падсочцы), абавязаць ЦК ЛКСМБ даць неадкладна паказаньні РК аб узмацненьні падсочкі камсамольскай праслойкай, накіраваўшы для працы непасрэдна на промыслах у якасьці здымачыкаў ня менш 300 камсамольцаў, в якіх 100 падрыхтаваць праз курсы ў якасьці майстраў для будучага сезону, якія павінны весьці барацьбу за выкананьне пляну, узьняцьце вытворчасьці, тэхнікі працы і высокую якасьць жывіцы.

8. Абавязаць цэнтральны і раённы друк пэрыядычна асьвятляць ход выкананьня пляну па здабычы жывіцы, мабілізаваўшы ўвагу грамадзкасьці да справы выкананьня пляну.

9. Абавязаць упаўнаркамлесу (**тав. Розіна**) узяць пад асабісты кантроль выкананьне пляну здабычы жывіцы, інфармуючы кожную дэкаду ЦК і СНК аб ходзе работы.

Аб прыёмцы некандыцыйнага збожжа і сена

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ БССР

Заслухаўшы паведамленьне Упаўнаважанага Белканторы Загатзбожжа т. **Журомскага** і групы Загатовак ЦКК КП(б)Б. т. **Абражэвіча** аб шэрых фактах прыёмкі збожжа і сена ад здатчыкаў прыемачнымі пунктамі Загатзбожжа павышанай вільготнасьці, якое без перасушкі ня можа захоўвацца на складах (30.VII-33 г. ад калгасу «**Пераможца**», Сычкаўскага с.-с., Бабруйскім прыём. пунктам Загатзбожжа прынята 400 клг. жыта вільготнасьцю ў 25 проц. Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК РСІ БССР **пастанаўляе:**

1. Забараніць сыстэме Загатзбожжа і спажыўсыстэме прымаць ад здатчыкаў некандыцыйнае збожжа і сена.

2. Прапанаваць гаркомам, РК КП(б)Б, гарсаветам, РВК, гар. і райКК-РСІ правесьці шырокую растлумачальную працу сярод калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў аб здачы імі дзяржаве збожжа і сена ўстаноўленых кандыцый, не дапускаючы прыёмкі некандыцыйнага збожжа і сена прыёмачнымі пунктамі Загатзбожжа і спажыўсыстэмы.

3. Прыняць да ведама заяву тав. **Журомскага**, што ім абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем заг. складам **Кісельману**, які прыняў збожжа павышанай вільготнасьці ад калгасу «Пераможца», а таксама абвешчана вымова ўпаўнаважанаму Белканторы Загатзбожжа ў Бабруйску т. **Самсонікаву**, які прысутнічаў пры здачы збожжа павышанай вільготнасьці калгасам «Пераможца» і ня прыняў мер, каб гэта збожжа ня было прынята.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ БССР ЛЫЧОЎ.

ВОРАГ З ПАРТБІЛЕТАМ ДЗЕЙНІЧАЕ

(ЛІСТ СЛУЖАЧАГА).

12 ліпеня г. г. «Зьвязда» ў артыкуле «Злачынец кіруе саўгасам» выкрыла рад злачынных фактаў, якія маюць месца ў саўгасе Рагінь, Буда-Кашалёўскага раёну.

У артыкуле ўказана, што дырэктар саўгасу тав. Шышкевіч дапамагае раскрадальнікам саўгаснага збожжа — Русецкаму, Балдоўскаму і інш., прыведзены важкія факты аб разбазарваньні збожжа, малочных прадуктаў і самім Шышкевічам.

Для расьсьледваньня паказаных у артыкуле фактаў 16 ліпеня ў саўгас Рагінь прыбыў старшыня Буда-Кашалёўскай РКК-РСІ тав. Чарняўскі і памнач райміліцыі тав. Дунэр.

Многім здавалася, што прыезд такіх аўтарытэтных кіраўнікоў пакладзе канец злачынай дзейнасьці Шышкевіча і вінаватыя панясуць пакаранньне, але... гэтага не здарылася. «Расьсьледваньне» гаворыць нам аб адваротным.

Прыбыўшыя «расьсьледвацелі» заехалі проста на кватэру да Шышкевіча. І ўжо 17 ліпеня ад іх можна было чуць гутаркі: «усё, што пісалі, гэта дарэмна, нельга капацца ў брудным бялізьне адказнага работніка, Шышкевіч добры гаспадарнік» і г. д.

Для «рэабілітацыі» Шышкевіча 18 ліпеня быў склікан сход рабочых, на якім выступіў т. Чарняўскі, які заявіў: «Мы павінны абгаварыць сур'ёзную справу, ці правільна напісана ў газэце, што ваш дырэктар жулік, заціскае рабочых, разбазарвае збожжа. Я прашу рабочых улічыць, што т. Шышкевіч добры гаспадарнік, і, нарэшце, будзе няправільна рабочым капацца ў яго брудным бялізьне. Я думаю, што няма нічога страшнага, калі Шышкевіч каму-небудзь адпусьціў з саўгасу кілёграм масла або галяндзкага сыру». Гэтым Чарняўскі выявіў сходу свае адносіны да фактаў, паказаных у артыкуле і даў адпаведны тон спрэчкам.

Пасьля такога «закліку» аднаго з кіраўнікоў раёну можна было быць загадзя ўпэўненым, што ніхто з рабочых ня стане таварыць аб Шышкевічы, як аб чалавеку, які разлажыўся, які страціў партыйны твар. Так яно і атрымалася.

З боку «любімчыкаў» пасыпаліся хвалебныя прамовы па адрасе Шышкевіча, накшталт: «папера ўсё церпіць, што напісана ў «Зьвязьдзе» — брахня, Шышкевіч наш бацька, ён добры чалавек!».

У ходзе «спрэчак» асобныя таварышы прабавалі даць зразумець тав. Чарняўскаму, што ў такой абстаноўцы нельга весьці абмеркаваньне пытаньня, але яго гэта не турбавала, бо, як відаць, ён меў мэтай ня выкрыцьцё Шышкевіча, а імкнуўся вывесьці Шышкевіча «сухім з мокрай справы».

Абагульваючы спрэчкі, гора-«расьсьледвацель» Чарняўскі заявіў: «Я думаю, што Шышкевіту мы слова даваць ня будзем, бо справа ясная, нічога дрэннага ён не зрабіў і ня будзем траціць час дарэмна. Я паведамлю ў рэдакцыю, што факты не пацьвердзіліся».

Але мы прыводзім некалькі фактаў у дадатак да таго, што ўжо прыводзілася ў «Зьвязьдзе». Вось якім шляхам ідзе разбазарваньне дзяржаўнай уласнасьці на заводзе.

1 мая 1933 г. 2 клгр. масла гр. Панову, 11 мая — 1 клгр. масла і 3 клгр. сыру Капілачову, 4 чэрвеня — 2 клгр. масла і 3 клгр. сыру Панову, 9 чэрвеня — 3 клгр. сыру камісіі віна заводу, 10 чэрвеня — 16 клгр. мукі і 8 клгр. круп аграному гомельскага Маслатросту Цішкевічу, 11 чэрвеня — 32 клгр. мукі Панаву, 7 ліпеня — 2 клгр. масла і 6 клгр. сыру — адказным работнікам Буда-Кашалёўскага райвыканкому.

Гэты сьпіс можна без асаблівай цяжкасьці павялічыць дзесяткамі іншых асоб, у тым ліку сярод іх вы знойдзеце прозьвішчы і т. т. Чарняўскага і Дунэра...

Але апрача прыведзеных фактаў, Шышкевіч займаўся простым ашуканствам дзяржавы. Усё гэта даволі ясна выкрыта газэтай «Зьвязда».

Шышкевіч ня здаў з ураджаю 1932 году 300 пудоў збожжа, належачага дзяржаве, ён прытаіў яго на «ўсякі выпадак». Сто пудоў збожжа Шышкевіч працягвае хаваць у сьвірне, як ліпак.

Прадстаўнікі РКК-РСІ замест выкрыцьця контр-рэвалюцыйнай палітыкі Шышкевіча, ухвалілі паводзіны перараджэнца, матывуючы тым, што план збожжаздачы з ураджаю 1932 г. па саўгасе выкананы на 100 проц.

На працягу двух месяцаў рабочым ня выплачана зарплата ў суме 12 тысяч руб. Інтарэсы рабочых Шышкевіч яўна ігнаруе.

За апошнія два-тры месяцы вымушаны былі найсьці з саўгасу - рабочыя-камуністы Новікаў Марк, Надтачова Дуся, Кулікаў, Гурар'е і інш., бо за спробы выкрыць Шышкевіча яны падпалі пад цкаваньне з яго боку.

Шышкевіч не саромячыся заяўляў: «Я выжыву з Рагінскай ячэйкі 10 чал. і толькі тады пайду сам».

Усе гэтыя дзеяньні буржуазнага перараджэнца — ворага з партбілетам у кішэні Шышкевіча, ячэйка ўскрыла, матар'ялы былі перададзены Буда-Кашалёўскай РКК-РСІ, але «расьсьледвацелі» давай справы Чарняўскі і Дунэр, жывучы 2 і 3 сутак у Шышкевіча, сталі на шлях [illegible] справы і ігнараваньня фактаў, узятых пад сваю абарону Шышкевіча.

Кічнеліў.

А. Чарнушэвіч

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ВЫСОКУЮ ЯКАСЬЦЬ ШКОЛЫ ДОБРАЙ ПАДРЫХТОЎКАЙ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Мы падышлі да другой пляцёлкі в рашаючымі посьпехамі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, таксама і ў галіне будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце.

У БССР мы ліквідавалі няпісьменнасьць, увялі ўсеагульнае на базе сямігадовай школы, мы ў гэтым годзе абавязаны пасадзіць за вучобу ў школе каля мільёна дзецвары.

Улічваючы адказныя задачы сапраўды пістарычнага этапу нашай пралетарскай рэвалюцыі, мы павінны перш за ўсё памятаць аб дзіцярнай адказнасьці за кожную нашу работу, за кожны рабочы дзень, за кожную нават непаліччоную справу, якую мы праводзім у штодзённай рабоце. Перад намі, работнікамі асьветы, стаіць баявая задача: забясьпечыць такую падрыхтоўку да новага навучальнага году, якая-б зрабіла яго **годам сапраўднага пералому ў барацьбе за павышэньне якасьці вучобы, за ліквідацыю «карэннага недахопу» работы школ.**

ЗА ПРАЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ!

Перш за ўсё трэба вынесьці рад палітычных урокаў мінулага навучальнага году. Першым, сур'ёзнейшым з іх зьяўляецца тыя палітычныя прарывы і скажэньні, якія мы мелі ў сыстэме народнае асьветы, асабліва ў галіне праваднога ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Усім нам памятна гісторыя зьдзекаў над настаўнікам Сыцкуцай, які, напісаўшы запіску ў сельсавет на рускай мове, кутарыўшы а жонкай на расійскай мове, падпаў пад жорсткія рэпрэсіі буржуазных нацыяналістаў, якія абвясьцілі яго вялікадзяржаўнікам, клясавым ворагам, контр-рэвалюцыянэрам.

Мы мелі клясава-варожыя вылазкі буржуазных нацыяналістаў у цэлым радзе навучальных устаноў. У Магілёўскім пед'інстытуце справа дайшла да таго, што студэнтаў, якія ў прыватнай гутарцы і жыцьці карысталіся расійскай мовай, кваліфікавалі як вялікадзяржаўнікаў, стварылі нявалол іх атмасферу цікаваньня.

Мы мелі ў мінулым годзе факты, калі вялікадзяржаўныя шавіністы ізмудзіліся скарыстаць барацьбу нашай партыі супроць мясцовых нацыяналістаў у сваіх вялікадзяржаўніцкіх мэтах, праганяючы «сказаваньне беларусізацыі» і г. д.

Вялікадушнае асобных дысцыплін у радзе вузаў ВНУ (ВПІ і інш.) таксама скарыстоўваліся клясава-варожымі, буржуазна-нацыяналістычнымі, | трацкіцкімі, буданўскімі, меншавіцкімі элемэнтамі.

Асноўны ўрок, які мы павінны вынесьці з такіх фактаў мінулага году — гэта **павышэньне клясавай пільнасьці.** Гэта асноўнае.

Рашучая барацьба з усялякімі праявамі буржуазнага нацыяналізму, штодзённая, сыстэматычная настойлівая барацьба за пралетарскі інтэрнацыяналізм — вось што павінна прасякнуць усю нашу работу ў сёлетнім навучальным годзе.

Кожная лекцыя настаўніка, кожнае масавае мерапрыемства ў вёсцы і ў горадзе павінны мець у сабе элемэнты жорсткай ваяўнічай барацьбы за асноўныя прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Забясьпечыць поўны штодзённы кантроль за выкладаньнем усіх дысцыплін у навучальных установах, з тым, каб своячасова рэагаваць на усе антыпралетарскія контр-рэвалюцыйныя вылазкі у якіх бы формах яны ні праяўляліся —задача НКА, усёй студэнцкай, асьветніцкай масы.

УСЕ РЫЧАГІ ШКОЛЬНАЙ РАБОТЫ—НА ПАВЫШЭНЬНЕ ПАСЬПЯХОВАСЬЦІ!

Наступны ўрок, які мы павінны ўзяць з мінулага навучальнага году, гэта пытаньне барацьбы з «карэнным недахопам», пытаньне барацьбы за ажыцьцяўленьне пістарычнай пастановы ЦК партыі аб школе.

Школа ў значнай ступені вызваліцца ад экспэрыментаў, узрасла роля настаўніка, падвялася дысцыпліна. Асобныя школы паказалі ўзоры высокай якасьці работы.

Але гэта — асобныя школы. Барацьба з карэнным недахопам на працягу мінулага году вялася **нездавальняюча.**

Ні ў адным райне яшчэ няма падстаў сказаць, што мы ў гэтым годзе маем вялізарныя посьпехі ў барацьбе з карэнным недахопам. Такія заявы — пустаслоўства, балбатня, дзьвярацьці, якія толькі перашкаджаюць большавіцкай барацьбе за выкананьне пастаноў партыі аб школе.

Якасьць вучобы ў многіх школах вельмі і вельмі нізкая. Вазьмеце выпучэньне беларускай роднай мовы. Пасьпяховасьць тут зусім нізкая. Вазьмеце граматнасьць пісаньня. Яна нават у 3, 4, 6, нават у 7 груне, у тэхнікумах — вельмі нізкая. У пед'інстытуце іншы студэнт на адной старонцы робіць дзесяткі памылак. Ці-ж гэта ня ганьба для загадчыкаў райвна, школ, настаўнікаў? У лёхушках, пазешных па сьценах школ, у пасьцелавоце — вы знойдзеце дзесяткі грубейшых памылак. Ня добра настаўнікі выпраўляюць спыткі вучняў, а загадчыкі райвна ня жорстка стаяць гэтым пытаньні. Гэта зусім недапушчальна. Мы павінны павесьці жорсткую штодзённую барацьбу, за правільнае пісаньне без памылак, скарыстоўваючы для гэтага ўсе рычагі ўзьдзеяньня.

Мы мелі факты, калі вучань 7 групы, падышоўшы да геаграфічнай карты, ня змог паказаць, дзе сталіца Беларусі — Менск, замест Оршы паказаў на Віцебск і г. д. Мы ня можам дапусьціць такога становішча, калі вучань (5-й групы) тлумачыў, што ў рады камуністычнай партыі прымаюцца ўсе тыя, хто зьбіраецца ўнам саюзу ад 18 год» (!?). Мы ня можам дапусьціць, каб вучань ня меў самых элемэнтарных ведаў.

Гэта не барацьба за дырэктыву партыі, а недапушчальная агідная работа, якая патрабуе жорсткага асуджэньня. За спраўду пасьпяховасьці вучобы нясе суд вінаватых. Задача раённых арганізацый заключаецца ў тым, каб ня толькі патрабаваць ад настаўніка (гэта мы павінны рабіць у першую чаргу), але і дапамагчы яму, забясьпечыць своячасовую выдачу паўка, зарплаты, забясьпечыць яго прамтаварамі.

Далёка нездавальняючае становішча мы маем з падборам кантынгенту для ВНУ. Ні адзін год мы не ўкамплектавалі педагагічныя ВНУ і тэхнікумы поўнасьцю. Пры гэтым мы маем там вялікі адсеў, зачастую лепшай часткі студэнтаў.

Адсюль задача стопроцантнага ўкамплектаваньня педагагічных ВНУ і тэхнікумаў паўстае з **усёй вастратою.** Выпрашыньне не патрабуе максімуму сіл і ўвагі ня толькі дырэктароў ВНУ і тэхнікумаў, загадчыкаў райвна, але і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Дапамога ў камплектаваньні навучальных устаноў, у забясьпячэньні спуладзіцца, у разгортваньні самакіравання, забясьпячэньні культурна-санітарнага становішча інтэрнатаў — усё гэта пытаньні, якія павінны зараз-жа прыкаваць увагу дырэктароў навуч. устаноў загадчыкаў рай і гарАНА.

ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ШКОЛ ПАМЯШКАНЬНЕМ, ПАДРУЧНІКАМІ, ПРЫЛАДАМІ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ.

У выкананьні дырэктыў ЦК партыі аб стабілізацыі падручніку мы працавалі наступным чынам: асноўную масу падручнікаў, зацьверджаных калегіяй НКА РСФСР, мы перакладаем на беларускую мову і друкуем для школ БССР. Пару дзесяткаў падручнікаў, якія патрабуюць мясцовага матэрыялу, мы выдаем арыгінальных.

Найменшасьць падручнікі, згодна нашай дагаворанасьці, будуць выдадзены у РСФСР, УССР. Частка найменшасьці падручнікаў друкуецца ў нас для усяго СССР.

Калі з мільёнаў падручнікаў мы павінны выдаць і завезьці ў школы да пачатку навучальнага году. Гэта адказная баявая задача, якую мы павінны выканаць.

У апошнія дні выпушчана каля 50 назваў падручнікаў. Але значная частка іх яшчэ не атрымана ў школах. На мясцох мы яшчэ маем агідныя адносіны з боку райвна, РВК, сельсаветаў да прасоўваньня падручнікаў у школы. Падручнікі асядаюць на чыгуначных станцыях, па шасэйных дзіх ляжаць у скрынках, псуюцца, ня выкупаюцца.

Падручнік — адзін з асноўных фактараў усяго школьнага працэсу — павінен быць своячасова дастаўлен у школу. А за гэта адказваць у першую чаргу загадчыкі райвна.

Дрэнна яшчэ ў нас з забясьпячэньнем школ мэблямі, палітэхнічным абсталяваньнем, дапаможнікамі, на што патрэбна мабілізаваць сілу і ўвагу нашых райвна.

Напружанае становішча з будаўніцтвам і рамонтам школ. Нам да навучальнага году трэба закончыць усе аб'екты будаўніцтва. **394 школы па БССР павінны быць зданы ў эксплёатацыю да 1-га верасьня.**

Між тым, значная частка школ, якія будуюцца, яшчэ на **сёмы** дзень не пагрыты, ня скончаны сталярныя работы і г. д. На мясцох прыняслі спасылацца на недахоп будаўнічых матар'ялаў. Трэба папярэдзіць, што ні ў якім разе нельга спадзявацца на адрыманьне поўнасьцю цэглікоў і шкла з Менску. Тут трэба прымаць меры на мясцох, **мабілізаваць усе магчымасьці, каб скончыць будаўніцтва і рамонт школ своячасова. А гэтыя магчымасьці ёсьць.**

У тэлеграме т. т. Гікало і Галадзеда дана строгая дырэктыва, пад персанальную адказнасьць старшынь РВК — скончыць будаўніцтва кожнага аб'екту школ да навучальнага году. Нішкія спасылкі на адсутнасьць матар'ялаў ня зьмяншаюць адказнасьці в загад

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

Бязупынныя арышты і сьмяротныя прысуды

БЭРЛІН, 5 (Белта). Згодна паведамленьня «Вольфа» і «Дэйчэ альгемэйнэ цэйтунг», каля Мандэбургу, у ваколіцах ЛІГНІЦА і Ў КОТБУСЕ нібыта рассакрыты камуністычныя арганізацыі. Арыштавана 196 чалавек у тым ліку былая камдэпутатка ляндтагу КІРШ, якая нібыта кіравала арганізацыяй у КОТБУСЕ. Паводле сьцьвярджэньня «Нахтаўсгабэ» у раёне ДОРТМУНДУ раскрыта нелегальная арганізацыя рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Як паведамляе «Вольф» арыштаваны ў ОЛЬДЭНБУРГУ сьлесар ДЫЛЕР застрэлен «пры спробе ўцякаць».

***

БЭРЛІН, 7 (Белта) Дармштацкі суд прыгаварыў гапоўнага абвінавачанага ў «забойстве членаў нацыянал-сацыялістычнай маладзёжнай арганізацыі» ў лютым гэтага году БЮХЛЕРА ДА КАРЫ СЬМЕРЦЮ. Яго бацька прысуджан да 10 год катаргі. Іншыя 4 абвінавачаных прысуджаны да катаржных работ ад 3-7 год кожны.

Масавае звальненьне адвакатаў

БЭРЛІН, 7 (Белта). На падставе закону аб «аднаўленьні саслоўя прафесыянальных чыноўнікаў», які прадугледжвае праверку складу адвакатуры і чыноўнікаў «пад расавым і палітычным пунктам гледжаньня,» у апошні тыдзень зволена 200 судзьдзяў і 185 адвакатаў. У адным Бэрліне зволена 130 адвакатаў, сярод зволеных у Бэрліне судзьдзяў 73 вышэйшыя судовыя чыноўнікі.

Гітлер адкладае „барацьбу з беспрацоўем"

БЭРЛІН, 6 (Белта) На канфэрэнцыі кіраўнікоў нацыянал - сацыялістскай партыі ў Обэрзальцбэргу (Баварыя) Гітлер заявіў, што «барацьба з беспрацоўем» падзяляецца на тры перыяды. Першы перыяд складала мінулае паўгодзьдзе, другі пачнецца з верасьня, трэці—вясною 1934 г. Такім чынам «барацьба супроць беспрацоўя» расьцягваецца ўжо на гады.

Рэзкае скарачэньне гандлю ў Германіі

Бэрлін, 5 (Белта). Паводле даных кон'юктурнага інстытуту, у красавіку звароты унівэрмагаў былі на 17,2 проц. У маі на 19,7 проц., а ў чэрвені на 22,2 ніжэй звароту адпаведных месяцаў 1932 г. Зварот з прадметамі першай неабходнасьці за першае паўгодзьдзе гэтага году на 20,7 проц. менш у параўнаньні з тым-жа перыядам мінулага году. У параўнаньні з 1925 г. звароты унівэрмагаў складаюць толькі 61,8 проц. Асабліва рэзка зьменшыўся продаж абутку і мэблі.

Замежная хроніка

* Сёньня ва ўсходняй частцы Бэйпіну японскія салдаты робяць здымкі вуліц.

* У Гавана (сталіца Кубы) і іншых гарадох бастуюць каля 20 тысяч рабочых аўтамабільнага транспарту, трамваяў і доку. Отачкі выклікалі буйныя замешкі ў транспарце і прамысловасьці. Дыктатар Мачадо пагражае абвясьціць ваеннае становішча.

* Францускія лётчыкі Кадос і Расьсі, паставіўшы мэтаю ўстанавіць сусьвет ны рэкорд на дальнасьць палёту на простай, вылецелі ўчора з Чыкаго. У дарозе яны 5 гадзін змагаліся з віхрам бураю. Сёньня лётчыкі праляцелі над Отрасбургом. Далейшы маршрут: Мюнхэн-Вена-Будапэшт, Алепо-Персідзкая затока. Апошні пункт—Нова Ургенча (Узбэкістан).

Манчжурскі мэмарандум і заява савецкай дэлегацыі на шостым пасяджэньні канфэрэнцыі ў Токіё

ТОКІЁ, 5. (БЕЛТА). На шостым пасяджэньні такійскай канфэрэнцыі кіраўнік манчжурскай дэлегацыі Тын Чжы-Юань агалосіў заяву манчжурскай дэлегацыі, у якой яна па-ранейшаму аспрэчвае права адпаасобнай уласнасьці СССР па КУЧ. Сьцьвярджаючы, што КУЧ належыць Манчжоу-Го і што Кітай па пэкінскай і мукдэнскай згодзе 1924 г. уступіў СССР толькі права прымаць удзел у кіраваньні дарогаю, манчжурскі мэмарандум адхіляе прапанову савецкай дэлегацыі ўзяць за аснову ацэнкі КУЧ гэтыя згоды і прапануе кіравацца цяперашняй каштоўнасьцю дарогі, з улікам рэнтабэльнасьці яе ў будучым.

Манчжурскі мэмарандум прызнае за конамерным захоп у дарогі зямельнай маемасьці, параходзтва і тэлефоннай станцыі і таму кошт іх ня можа быць уключан у лік маемасьці, падлягаючай продажу. Манчжурская дэлегацыя згаджаецца прызнаць вялікую каштоўнасьць КУЧ для Манчжоў-Го, але лічыць, што дарога сваю вялізарную каштоўнасьць для СССР у сучасны момант страціла і новае чыгуначнае будаўніцтва ў Манчжурыі, правадзімае Манчжоў-Го, зьніжае каштоўнасьць дарогі. Апрача таго, становішча палатна, станцыйныя пабудовы і г. д. патрабуюць значных сродкаў для іх рамонту.

Выходзячы з гэтых палажэньняў, а таксама з фінансавага становішча Манчжоў-Го, манчжурская дэлегацыя прапануе савецкаму боку згадзіцца на прапанаваную дэлегацыяй цану за КУЧ і маемасьць апошняй у 50 млн. іен і, прыняўшы гэтыя ўмовы, зрабіць магчымым пасьпяховае завяршэньне перагавораў.

Пасьля манчжурскай дэклярацыі тав. **Юрэнеў** агалосіў заяву савецкай дэлегацыі, у якой, адзначыўшы, што ў агалошаным раней на канфэрэнцыі савецкім мэмарандуме вычарпальна і дзелавым чынам праведзен пункт погляду савецкага боку на ўсе пытаньні, зьвязаныя з перагаворамі аб продажы КУЧ, пакінуў за савецкай дэлегацыяй права пасьля вывучэньня манчжурскай заявы адказаць па тых яго пунктах, якія маюць простыя непасрэдныя адносіны да канфэрэнцыі.

Што-ж датычыць пытаньняў, якія ня маюць ніякіх адносін да канфэрэнцыі і зусім бясспрэчны ў сілу існуючых згод і агульна-вядомых фактаў, дык савецкая дэлегацыя па-ранейшаму пярэчыць супроць якой-небудзь дыскусіі па іх.

Далей тав. **Юрэнеў** заявіў, што імкнучыся да хутчэйшага і пасьпяховага завяршэньня перагавораў, савецкая дэлегацыя гатова зьнізіць, ня гледзячы на ўсю ўмеранасьць і поўную абгрунтаванасьць прапанаванай ёю цаны, цану дарогі на 50 млн. залатых рубл.

Тав. **Юрэнеў** прапанаваў неадкладна перайсьці да сур'ёзнага і дзелавога абмеркаваньня пытаньняў, зьвязаных з продажам дарогі, і выказаў упэўненасьць, што манчжурская дэлегацыя праявіць таксама гатоўнасьць дабіцца посьпеху ў даных перагаворах на аснове пашаны і захаваньня існуючых дагавораў.

Германія патрабуе звароту Саарскай вобласьці

Фон-Папэн аб германа-францускіх адносінах

ЛЁНДАН, 6 (Белта) Спэцыяльны карэспандэнт **«Сэндэй экспрэс» Дэльмэр,** які меў гутарку з **Папэнам,** паведамляе, што Гітлер даручыў Папэну ўступіць у кантакт з прадстаўнікамі Францыі для палепшэньня адносін паміж дзьюма краінамі. Дэльмэр указвае, што гэта мера выклікана ўзрастаючай ізаляцыяй Германіі. Папэн заявіў Дэльмэру, што Германія гатова пайсьці насустрэч Францыі ў вырашэньні ўсіх асноўных пытаньняў, якія датычаць будучыні Саарскай вобласьці.

«Германія — гаворыцца ў інтэрв'ю —прапануе, каб па першае Францыя дагаварылася з ёю аб Саарскай вобласьці «кулейным спосабам», не зварачаючыся да плебісцыту, прадугледжанага Вэрсальскім дагаворам па 1935 г.»

«Па другое — заявіў Папэн — нягумненна Саарскую вобласьць павінны цалкам вярнуць пад поўны суверэнітэт Германіі. Нарэшце, па трэцяе, Германія ўсамен гатова згадзіцца на ўстанаўленьне доўгага пераходнага перыяду, на працягу якога будуць шырока забясьпечаны агульна-прызнаныя буйныя французкія інтарэсы ў Саарскай вобласьці».

ПАЗШ фінансуюць вайсковую авіяцыю Кітаю

ТОКІО, 5 (Белта) «Асахі», спасылаючыся на «верагодныя крыніцы», паведамляе, што памяж **Альфрэдам Шы** (кітайскі пасланьнік у ПАЗШ) і амэрыканскім урадам заключана сакрэтная згода аб «стварэньні магутнага паветранага флёту ў Кітаі», у мэтах гарантаваньня «ажыцьдзяўленьня пакту 9 дзяржаў і захаваньня тэрытарыяльнай недатыкальнасьці Кітаю».

Згода прадугледжвае снабжэньне Кітаю на працягу пяці год 1200 васенных самалётаў. На працягу першых трох год Кітай апрымае 330 разьвядчых самалётаў, 269 зьнішчальнікаў, 155 лёгкіх і 90 цяжкіх бамбавозаў. Апрача таго, у Кітаі будзе набудован авіязавод, рамонтныя майстэрні, аэрамы і авіяшколы, у якіх будуць выкладаць амэрыканцы. Уся праграма для свайго ажыцьдзяўленьня патрабуе 40 млн. амэрыканскіх даляраў. Палова прадастаўляецца Пашкінскім урадам, палова Амэрыкай у параўнаньні доўгатэрміновай пазыкі. «Асахі» падкрэсьлівае, што ў японскіх колах гэту згоду лічаць пагрозай для японскай абароны.

Паўторная чыстка ячэек Макшанскага сельсавету

Пастанова Віцебскай гарадзкой камісіі па чыстцы ад 5-VIII—1933 г.

У сувязі з маючымі месца фактамі прубейшых парушэньняў яўна бюракратычных адносін як партыйраўніцтва, так і ўсёй парт'ячэйкі Макшанскага сельсавету да адказьнейшых і важнейшых дырэктыў партыі—аб першачарговым выкананьні калгасамі і калгасьнікамі сваіх абавязацельстваў па здачы дзяржаве збожжа, ігнараваньні фактаў разьмеркаваньня часткі калгаснага ўраджаю ў калгасе імя Сталіна, імя Калініна, нават да пачатку арганізацыі збожжаздачы, што зьвяўляецца простым праяўленьнем антыдзяржаўнай тэндэнцыі і адкрытай спробай кулацкага сабатажу збожжазагатовак — **лічыць неабходным правесьці паўторную чыстку парт'ячэйкі Макшанскага сельсавету.**

Прымаючы да ведама заяву старшыні праверкому тав. Ліськевіча і члена праверкому т. Казарэка, што імі была сваячасова пастаўлена, як перад упаўнаважаным гаркому па Макшанскаму сельсавету тав. Блякманам, так і перад партарганізацыямі калгасаў і агульным сходам парт'ячэйкі пытаньне аб абсалютнай недатыкальнасьці разьмеркаваньня часткі ўраджаю памяж калгасьнікамі да выкананьня калгасамі дзяржаўных абавязацельстваў, —адзначыць, што ў даным важнейшым палітычным пытаньні з боку тав. Ліськевіча і Казарэка, якія не паставілі гэтага пытаньня ні перад гарадзкой камісіяй па чыстцы, ні перад гаркомам КП(б)Б, якія не давялі справы да канца,—былі праяўлены палітычная блізарукасьць і гніла-ліберальныя адносіны да зрыўшчыкаў і сабатажнікаў справы збожжапаставак.

У сувязі з вышэйпаказаным вызвалі ліць старшыню праверкому тав. Ліськевіча і члена праверкому тав. Казарэка ад абавязкаў старшыні і члена праверкому.

Папярэдзіць вясковыя праверкомы, што іх простым абавязкам зьяўляецца праверка і дапамога партарганізацыі ў справе арганізацыі першачарговага выкананьня перад дзяржавай абавязкаў па збожжапастаўках, выкрыцьцё новых мэтадаў супрацьдзеяньня, сабатажу з боку клясавага ворага і яго агентаў у перыяд уборачных і загатоўчых работ (затрыманьне ўборкі, затрыманьне абмалоту, затрыманьне збожжаздачы дзяржаве, раскрадваньне калгаснага збожжа і г. д.).

Указаць праверкомам і вясковым парт'ячэйкам, што ўборка і першачарговае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай зьяўляюцца баявым палітычным экзамэнам для ўсёй вясковай партарганізацыі, праверкай яе баяздольнасьці і непрымірымасьці да клясавага ворага, кулака і яго агентаў—перараджэнцаў, магутнай зброяй сацыялістычнага выхаваньня калгасьнікаў.

Віцебская гарадзкая камісія па чыстцы КП(б)Б.

Дацкія і ангельскія партавікі адмаўляюцца разгружаць германскія пароходы

СТАКГОЛЬМ, 5 (Белта) Як паведамляюць з КАПЭНГАГЕНУ, у дацкіх гаванях адбыўся рад забастовак партавікоў, якія адмовіліся разгружаць германскія судны з фашысцкім сьцягам, ня гледзячы на забарону стачак рэфармісцкімі лідэрамі. У гавані АБОН рабочая команда германскага параходу прабавала пад аховай паліцыі разгрузіць пароход з дапамогаю штрэйкбрэхэраў. У адказ на гэта партавікі нападзілі магутную дэманстрацыю. Высунута патрабаваньне неадкладна зваліць начальніка партавой паліцыі, які бярэ пад апеку германскіх фашыстаў і дацкіх штрэйкбрэхэраў.

***

ЛЁНДАН, 5 (Белта) 4-га жніўня ў доку НОРДШЫЛЬДУ ўвайшоў германскі пароход пад фашысцкім сьцягам. Ангельскія грузчыкі пастанавілі спыніць работу, калі ні будзе зьнят фашысцкі сьцяг. Калі германскім маракам заявілі аб пастанове докераў, мараякі заявілі, што далучацца да забастоўкі. Ангельскія грузчыкі і германскія маракі брацаліся. У разультаце дэманстрацыі капітан спусьціў фашысцкі сьцяг. Пасьля гэтага грузчыкі прыступілі да работы.

***

БЭРЛІН, 7 (Белта). Агэнцтва «ВОЛЬФ» паведамляе: «Віцэ-канцлер заяўляе, што карэспандэнт «СЭНДЭЙ ЭКСПРЭС» наведаў Папэна без папярэдняга ўгавору ў часе яго прабываньня ў замку Валерфанген у Саарскай вобласьці, каб у прыватнай гутарцы інфармавацца аб саарскім пытаньні». Агэнцтва заяўляе далей, што Папэн «не даваў ніякага інтэрв'ю газэце і што карэспандэнт перадаў зьмест гэтай прыватнай гутаркі ў зусім скажонай і частковa супярэчлівай сэнсу выказваньняў фон Папэна форме. Вось чаму зьме шчаная газэтай карэспандэнцыя ніякім чынам не перадае поглядаў віцэ-канцлера ў саарскім пытаньні».

Увядзеньне прымусовага ўрадавага арбітражу ў ПАЗШ

Здрада рэфармісцкага саюзу гарнякоў

НЮ-ЁРК, 5 (Белта) РУЗВЭЛЬТ абвясьціў, што аб'яднаны саюз гарнякоў (які далучаецца да рэакцыйнай амэрыканскай фэдэрацыі працы) даў згоду на спыненьне стачкі ў ПІЦБУРСКІМ раёне ў чаканьні выпрацоўкі «кодэксу сумленнай канкурэнцыі» для бітуміноўных шахт. У далейшым, да апублікаваньня кодэксу, ПРАФБЮРАКРАТЫ І ПРАДПРЫЕМЦЫ ЗГОДНЫ ПРАДСТАЎЛЯЦЬ УСЕ КАНФЛІКТЫ НА РАЗБОР АРБІТРАЖНАЯ КАМІСІІ, якая складаецца з старшыні буйнейшай электрафірмы «Джэнэраль электрык» СВОПА, міліянэра гандляра КІРШТЭЙНА і бюракрата з амэрыканскай фэдэрацыі працы БЭРРЫ. У паведамленьні Рузвэльта ўказваецца, што стачка пагражала ахапіць усю вытворчасьць бітуміноўнага вугалю і ставіла пад пагрозу вугольнае снабжэньне сталеліцейнай прамысловасьці. Друк адзначае, што згода па пытаньні аб вугольным канфлікце становіць сабою ПЕРШЫ КРОК ДА ЎВЯДЗЕНЬНЯ АГУЛЬНАЙ СЫСТЭМЫ ЎРАДАВАГА АРБІТРАЖУ.

Усебеларускія водныя спаборніцтвы ў Віцебску

Усебеларускія водныя спаборніцтвы ў Віцебску адкрыліся масавым парадам, у якім прынялі ўдзел 6 тысяч фіз культурнікаў.

Парад, як і падрыхтоўка да сьвята, прайшоў пад лёзунгамі масавага ўцягненьня ў здачу норм па комплексу ГПА маладых шэрагавікоў-ударнікаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Арганізацыя сьвята і само сьвята паказалі карэнныя зрухі ў рабоце фізкультурных арганізацый Віцебску.

Фабрыка «КІМ», на якой з двух тысяч моладзі сыстэматычна займалася фізкультурай толькі чалавек 18, зараз мае 300 фізкультурнікаў. Памяж буйнейшымі фабрыкамі гораду («Дзьвіна,» «КІМ», «Пралетары» і інш.) заключаны сацыялістычныя дагаворы на лепшую пастаноўку фізкультурнай работы, на больш масавы адпор моладзі гэтымі гурткамі, на якасьць падрыхтоўкі да здачы норм па комплексу.

Водныя спаборніцтвы цягнуліся тры дні на р. Віцьбе.

300 лепшых фізкультурнікаў БССР прынялі ўдзел у здачы норм па другому комплексу ГПА. 11 раёнаў БССР, плюс каманда майстраў-плыўцоў СССР (Масква) ў працягу трох дзён спаборнічалі па ўсіх відах воднага спорту.

У выніку — на першае месца выйшла каманда Гомелю, на другое — Бабруйску і на трэцяе — Віцебску. Менск выйшаў на шостае месца, а на плаваньні ён заняў трэцяе.

Лепшыя рэзультаты ў заплыве на 100 мэтраў паказалі: **Арлоў** (Віцебск), **Маслоў** (Полацак), **Барабанчыкаў** (Гомель) і дынамавец **Камароўскі** (Менск).

Майстар па плаваньні масквіч **Паўтарак** паказаў час у заплыве на 100 мэтраў 18 мін. 0,1 сэкунды; **Арлоў**—20 мін. 0,8 сэк.; **Маслоў**—20 мін. 0,9 сэк. Такім чынам плыўцы БССР па плаваньні маюць найгоршыя паказальнікі.

Сьвята закончылася на Віцьбе паказальнымі скачкамі майстраў Масквы т. т. **Ануфрыева, Жыгалава** і інш.

Вал. М.

Хроніка

* Разгорнуты падрыхтоўчыя работы і геалёгічныя дасьледаваньні па будаўніцтве другой ДРЭС на Гомельшчыне. Ужо дасьледавана плошча 5 тысяч га ў Гомельскім, Веткаўскім, Рэчыцкім і Церахаўскім раёнах, дзе знойдзены шмат торфяных масываў, аграрудаў—для ўтаеньня, гліны, вапны, гравія, матар'ялаў для вырабу фарбы і пласкі для шкла. Новая электрастанцыя ператворыцца магутнай энэргетычнай базай для разьвіцьця прамысловасьці ў гэтых раёнах.

* Усебеларускі рэйд па праверцы ўраджаю праводзіць ВОФКВ. У рэйдзе прымуць удзел звыш 500 фізкультурнікаў—вэлясыпэдыстаў і матацыклістаў.

* Гісторыя беларускай літаратуры складаецца інстытутам ЛІМ. Першы том гісторыі, які ахапляе літаратурны рух у дакастрычніцкі перыяд, ужо рыхтуецца да друку.

* Да дня авіяцыі—18 жніўня—ваенна-абарончая камісія пры аргкамітэце ССП выпускае спэцыяльны альманах, складзены з твораў: Лынькова, Барысава (Смаленск), Баранава (Віцебск), Барашні, Вольнага, Аляксандровіча, Харыка і інш.

Паведамленьні

Культпроп ГК КП(б)Б даводзіць да ведама ўсіх партыйных калектываў і ячэек, членаў і кандыдатаў партыі, што пасьля рамонту 7 жніўня адновіў работу Дом Камасьветы. Бібліятэка і чытальня адкрыты штодзённа з 10 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара.

Кансультацыя па пытаньнях 30-цігодзьдзе 2-га зьезду партыі і пастановах VII аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з 6 гадзін да 10 гадзін увечары. Уваход па партбілетах.

КУЛЬТПРОП ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЕНЬНЯ, у 7 гадзін вечара, рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА" сумесна з **СЭКТАРАМ СНАБЖЭНЬНЯ НАРКАМЗЕМУ**

ПРАВОДЗЯЦЬ ШЫРОКУЮ НАРАДУ

па пытаньні завозу ў раёны гаручага і змазачных матар'ялаў.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі ўсіх трактарацэнтраў Насенсаўгастрэсту, садова-агароднага трэсту, Лугтрэсту, Наркамсаўгасаў, менскіх Сьвінаводтрэсту, Малакапрамтрэсту, Птушкатрустрэсту упаўнаважаны Саюзнафтгандлю, загадчык менскага нафтаскладу БКС

Усе таварышы павінны будуць зрабіць інфармацыю аб становішчы завозу гаручага па сваіх сыстэмах.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА" 3-ці паверх.

Прамгрупа і групы снабжэньня і кааперацыі ЦКК-НК РСІ Бел. сумесна з рэдакцыяй газэты „ЗЬВЯЗДА" і „РАБОЧИЙ" скліканюць **8 жніўня** 1933 году ў 6 з паловай гадзін вечара

ШЫРОКУЮ НАРАДУ ПА ПЫТАНЬНІ ХОДУ ВЫРАБУ І АДГРУЗКІ ТАВАРАЎ ШЫРОСПАЖЫВУ НА ВЁСКУ.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі наступных арганізацый і прадпрыемстваў з адпаведнымі матар'ялам на гэтым пытаньні: Наркамзняпраму, Наркамлёгпраму, Белмэталятрэсту, Цэйтрэсту, заводу імя Варашылава, „Камуністу", абутковай імя Кагановіча, „Кастрычнік", сампрамкаапэрацыі, Белкаапсаюзу, Белгандлю, Шкэйбыту, Скурсбыту, загадчыку складу і баз БКС і Белгандлю.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні ЦКК-НК РСІ Бел. (Савецкая, 55, 3-ці паверх, пакой № 12).

Адказнасьць за яўку ўскладаецца на сакратароў парт'ячэек і кіраўнікоў гэтых арганізацый.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЗЦ гор. Масква

Гарадзкі сад Дзяржцырк —ШАПІТО.

Сёньня і штодзённа вялікая праграма Першыя гастролі замежных артыстаў ГУГЛЕЛЬМОНІ— МУЗЫКАЛЬНЫ КАМБІНАЦЫЙНЫ АКТ.

Прыехалі і выступаюць 4 Дмываньні—паветраны палёт пад купалам цырку. Весёлыя дачарпы—матрэскія танцы. Гастролі папулярнага артыста Леанідаў Іванова—група прэсіраваных сабак, мэлпаў, нарлюдаў, пані. Германскі атракцыён Паультон і Дальцей—цыясты-вялісьпэдысты. Чужаземная стайня—Кайзэр-Барум—новая дрэсіроўка і шмат іншых нумароў.

ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня. Замежны фільм АПОШНІ РАМІЗЬНІК БЭРЛІНУ Драма ў 7 частках

„ПРАЛЕТАРЫ" Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. веч. Лепшы замежны фільм ВАЛАЦУГА

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Мастацкі фільм ПАЭТ І ЦАР

ДЗІЦЯЧЫ ГУЛЯБЫ кіно-тэатр 3-я СЭРЫЯ „Чырвоныя д'ябаляты" („САВУР МАГІЛА")

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. Замежны фільм НІНІШ кіно-раман у 8 частках

ГАРАДОЦКІ ТЭХНІКУМ механізацыі сельскай гаспадаркі (трактары) у гор. ГАРАДКУ на ВІЦЕБШЧЫНЕ АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на першы і другі курс.

Да заявы патрэбна далучыць наступныя дакументы: анкету, асьв. арганізацыямі на ніжэй рабочага маштабу, мандрыку або даведку аб годзе нараджэньня, пасьведчаньне аб адукацыі, аб сацыяльным і матар'яльным стане да рэвалюцыі і ў сучасны момант, даведку аб працоўным стажы паступаючага і яго бацькоў, копіі: вайсковага дакумэнту (для асоб прызыўнога ўзросту), для кандыдатаў—даведку аб адукацыі, аб сьвядоцтвы, аб стане здароўя і прыкладны вагы, тры фотакарткі з засьведчаным подпісам паступаючага на кожнай.

На першы курс прымаюцца асобы ад 15 да 30 год, маючыя веды ў аб'ёме сямігодкі. Паступаючым на другі курс дазваляецца дасьлядаваць на электрабазе. Скончыўшыя курс атрымліваюць званьне тэхніка-механіка МТС і МТМ. Усе паступаючыя на першы курс павінны трымаць іспыты па матэматыцы, родной мове, грамадазнаўству, хэміі і фізыцы ў аб'ёме праграмы сямігодкі. Даю чанымі да іспытаў дазваляюцца тэхнікумам аб тэрмінах іспытаў, без паведамленьня аб гэтым зьвяўляцца ў тэхнікум не патрэбна.

Студэнтам забясьпечваюцца стыпэндыяй згодна кастановых ураду і інтэрнатамі. Пры тэхнікуме ёсьць закрытая сталоўка і пасобная гасьцяварня, забясьпечваю чая харчаваньнем.

Заявы прымаюцца па 25 жніўня г. г. Пачатак заняткаў—1-га верасьня 1933 г.

Дырэкцыя тэхнікуму.

Менскі гарком КП(б)Б, рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасніца Беларусі" і Цэнтральны Дом Тэхнікі скліканюць 10 жніўня

ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ работніц-вынаходцаў, рацыяналізатараў і герояў першай пяцігодкі

па пытаньнях:

1. Удзел работніц у вынаходзтве і рацыяналізацыі.
2. Палепшэньне якасьці тавараў шырокага спажыву.

Зьлёт пачне працаваць з 7-й гадзіны вечары ў Цэнтральным Доме Тэхнікі (Камсамольская, 25).

Уваход па запрашальных білетах.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ!! ДЗЯЎЧЫНА З ДЖУНГЛЯЙ

ПОЛЬСКІ ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ імя Бр. Всяслоўскага ў Менску абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР

на 1933-34 навучальны год на 1-ы і падрыхтоўчы курс. Скончыўшыя 7 гр. паліэтэхнічай польскай школы або беларускай, якія ведаюць польскую мову, прымаюцца на 1-ы курс. Скончыўшыя 6 груп—на 3-кімсячны падрыхтоўчы курс. На 1-ы курс і падрыхтоўчы прымаюцца асобы не маладзей 15 год. Рабочыя, калгаснікі і адпаведныя—беднякі вытрымліваюць стыпэндыю Інтэрнат. Для паступленьня ў польпэдтэхнікум неабходны наступныя дакумэнты: 1) даведка аб сацыяльным стане вішчы—калгасьніка ці адпаведнасьці (або вызкова за подпісам старшыні с.-с.), даведка аб с.-г. падатку ў 1932-33 г. (адзначыць у выданай даведцы—для польпэдтэхнікуму ў Менску), 2) пасьведчаньне аб асьвеце; 3) мандрыка аб нараджэньні або пашпарт; 4) даведка аб стане здароў'я.

Польпэдтэхнікум зьвяртаецца з просьбай да школ, сельсаветаў, калгасаў, саўгасаў, партыйных і камсамольскіх ячэек аб правядзеньні адпаведнай арганізацыйнай работы і накіраваньні лепшых кандыдатаў на савецкіх настаўнікаў. Пачатак заняткаў з 1-га верасьня. Заявы і дакумэнты будуць прымацца да 30-га жніўня. Кожны паступаючы пасьля подачы дакумэнтаў вытрымлівае паведамленьне аб выніках прыёму. Без паведамленьня аб прынятасьці паступаючы вымяжнець не павінен. Кожны паступаючы павінен мець сваю пасьцель, сьнідзік і 30 руб. для харчаваньня на першы месяц да вытрымкі стыпэндыі. Заявы разам з дакумэнтамі (з указаньнем кватэры адрасу) адсылаць пасьлядна на адрас: Менск, Савецкая 144, дырэктару польпэдтэхнікуму.

Дырэкцыя.

Саюзны тэхнікум прамысловага хлебапячэньня ў гор. Менску АБВЯШЧАЕ дадатковы набор

студэнтаў на вінкурнае аддзяленьне (тэхніка-тэхнолёга).

Адначасова працягваецца набор на аддзяленьне хлебапякарнай прамысловасьці саюзнага значэньня (тэхніка-тэхнолёга і тэхніка-эканаміста)

Правілы прыёму аднолькавыя, што і у іншых тэхнікумы.

Прыём заяў—да 25 жніўня.

Адрас: Менск, Пакгорны заз. 7.

БЕЛГАНДАЛЬ праводзіць НАБОР у школу гандлёва-таваразнаўчага вучнёўства па падрыхтоўцы кваліфікаваных працаўнікоў магазынаў і складаў.

Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодкі на ўзросьце ад 17 год. Да заявы неабходна прыкласьці засьведчаную анкету, даведкі і аб сацыяльным стане вішчы, аб узросьце, аб здароўі і марки на 40 кап. для адказу. Прыём заяў да 1 верасьня. Школа забясьпечвае інтэрнатам, стыпэндыяй і сталоўкай.

Адрас: Менск, Савецкая, 47, Белгандаль, група кадраў.

ПРАДАЕЦЦА ПАПЕРА-МАКУЛАТУРА

Зварачацца: Савецкая, 63, 2-ці паверх кантора друкарні „ЗЬВЯЗДА".

МАЗЫРСКАЯ ТАВАРАВЕДЧА-ЗАГАТОЎЧАЯ ШКОЛА БЕЛКААПСАЮЗУ абвяшчае асеньні набор

у школу на аддзяленьні: малако, малочныя прадукты і яйкі; плодагародніна пушніна і сырсыравіна.

У школу прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку ва ўзросьце ад 16 год. Тэрмін навучаньня—2 гады. Школа рыхтуе работнікаў для сыстэмы спажывецкай кааперацыі наступных пасад: адказнага выканаўцы—інструктара па загатоўках пры райспажыўсаюзе, загадчыка загатоўнага райспажыўсаюзу, або галінных аб'яднаньняў, прыёмшчыка сыравіны і сельска-гаспадарчых прадуктаў і загадчыка раённага сыравіннага складу пры райспажыўсаюзе.

Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Прыём заяў—да 20-га жніўня. Іспыты—з 20-га па 25-га жніўня. Зьнятні пачнуцца з 1-га верасьня г.г. У заяве неабходна ўказаць, на якое аддзяленьне жадае паступіць. Да заявы прыкласьці засьведчаную анкету, пасьведчаньне аб сканчэньні сямігодкі, аб сац. становішчы, аб узросьце і аб стане здароўе.

Заявы накіроўваць па адрасе: г. Мазыр, Пляц Волі, 16 кавпшкола.

Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКІ дзяржаўны унівэрсытэт абвяшчае асеньні набор

студэнтаў на наступныя факультэты:

1. Фізмат—110 чал. (35 матэматычнае аддз. і 55—фізычнае). 2. Біафак—50 чал 3. Хэмфак—55 чал.

На вячэрні сэктар: фізмат—60 ч. хэмфак—30 ч., біафак—30 чал.

На рабочы факультэт—двое аддзяленьне і, II і III курсы 250 чал. (з іх яўрэйскае і польскае аддз. па 35 чал.).

Вячэрняе аддзяленьне I, II, III і IV курсы—420 чал., з іх на яўрэйскае аддзяленьне 90 чал.

З восені бягучага году пры БДУ адкрыецца інстытут асьпірантуры

У гэтым годзе вызначаецца прыём у інстытут асьпірантуры ў колькасьці—13 чал. па спэцыяльнасьцях: фізыкі, матэматыкі і хэміі.

Заявы прымаюцца да 10 жніўня на асновных факультэтах БДУ і ў інстытут асьпірантуры—у канцылярыі БДУ, а на раб. фак—у канцылярыі рабфаку (Менск, Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус) Узрост для паступаючых—на рабфак да 30 год, на ўсе факультэты і ў інстытут асьпірантуры да 35 год. Іспыты, згодна існуючых правіл для паступленьня на рабфак і ў вышэйшыя навучальныя установы, пачнуцца з 20 жніўня. Дакумэнты дадаюцца ў арыгіналах, згодна даведніка НКА БССР аб прыёме ў ВНУ і рабфакі і аб прыёме ў інстытут асьпірантуры (гл. аб'яву ў газэце „Зьвязда" № 140, ад 23-VI 1933 г.). Да дакумэнтаў неабходна прыкласьці 2 засьведчаныя фотакарткі.

Рэктар БДУ Ермакоў.

Менскі дзяржаўны індустрыяльна-педагагічны тэхнікум імя ШАРАНГОВІЧА, які рыхтуе тэхнікаў-інструктараў вытворчага навучаньня ў ФЗС і кіраўнікоў-арганізатараў вучнёўскай працы на прадпрыемствах

абвяшчае асеньні НАБОР

на аддзяленьні:

1) мэханічнай апрацоўкі мэталю—60 чалавек, 2) мэханічнай апрацоўкі дрэва—30 чал., 3) на мэханічнай апрацоўцы мэталю і дрэва (яўрэйскія сэкцыі) 30 чалавек.

Праводзіцца набор у групы II-га курсу на паказаныя аддзяленьні.

Паступаючыя падлягаюць іспытам па курсу сямігодкі па матэматыцы, фізыцы, грамадазнаўстве і беларускай мове.

Іспыты — з 25 жніўня. Заняткі — з 1 верасьня. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Да заявы прыкласьці дакумэнты, згодна даведніка НКА для паступленьня ў тэхнікумы. Тэрмін падачы заяў да 20-га жніўня. Адрас: Менск, вуліца Валадарскага, 5, тэл. 21—823.

Дырэкцыя.

Барысаўская лесашкола абвяшчае асеньні НАБОР

НА АДДЗЯЛЕНЬНІ:

лесаэксплёатацыйнае —35 чал.
лесасплаўнае . . —35 чал.
мэханічнай перапрацоўцы драўніны і мэханічных установах . —70 чал.

У школу прымаюцца асобы, маючыя адукацыю за 5, 6 і 7 груп сямігодкі. Тэрмін навучаньня два гады, Школа рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі па лесаэксплёатацыі, леса сплаву і па мэханічнай перапрацоўцы драўніны і мэханічных установах.

Да заявы патрэбна далучыць засьведчаную анкету даведку аб сацыяльным становішчы, аб адукацыі, медыцынскі выпіс і аб стане здароўя.

Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Стыпэндыя на 1-м курсе ад 30 да 45 руб., на 2-м курсе ад 45 да 70 руб. у месяц у залежнасьці ад пасьпяховасьці.

Заявы прымаюцца да 20 жніўня, пачатак заняткаў з 1 верасьня.

Заявы з усімі дакумэнтамі накіроўваць па адрасу: гор. Барысаў, Кіраўская, 22, Лесашколе.

Дырэктар Лесашколы М. ГУРМАН.

МЕНСКІ РАБОЧЫ ФАКУЛ